№ 19 (377) 21 траўня 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы




**Як стаць папулярным**
Беларускі шоў-біз.
Тэма нумару.
старонкі 5–8

**Deadline 1 чэрвеня**
Газ: Расея спакушае Украіну, каб задушыць Беларусь?
старонка 3

**Чытайце «День», каб не настала ноч**
Даніла Жукоўскі ў абарону калябарантаў і здраднікаў.
старонка 10

**Гуда**
Працяглы аб'ёмны гук, які ахоплівае. Ніякага музычнага суправаджэньня. Такога няма больш нідзе ў сьвеце. Канцэрт «Гуды» —
старонка 2

**Хлябанава з Кортні Лаў**
Беларуская топ-мадэль Кацярына Хлябанава зьнялася ў фатасэсіі са скандальнай сьпявачкай Кортні Лаў.
старонка 4

**Блакітны зьніч**
Новая кніга Янкі Брыля.
старонка 14

# Дарога ў нікуды




КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

Палата прадстаўнікоў не рэкамэндуе прызнаваць выбары законнымі. Старонка 2.

# Балтыка чакае

«Наша Ніва» абвяшчае конкурс для падпісчыкаў. Галоўны прыз пераможцу — адпачынак на Балтыйскім моры. Каб узяць удзел у конкурсе, дасылайце копіі падпісных абанэмэнтаў на 2-е паўгодзьдзе 2004 году на адрас Рэдакцыі.

Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Цана на месяц — 2580 рублёў на поштах або 1800 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». Гэта нашмат таньней, чым ураздроб.



Дык падпісвайся!

# Ізаляцыя краіны замест ізаляцыі рэжыму

**Эўразьвяз пакуль што не гатовы разглядаць Беларусь як незалежную дзяржаву. Ён пагадзіўся з існаваньнем малюсенькай расейскае зоны ўплыву на ўсходзе Эўропы. Як іначай растлумачыць праект «Палітыкі эўрапейскага суседзтва» і той факт, што ў праграмах фінансавае дапамогі суседзям Зьвязу Беларусь займае апошняе месца?**

На мінулым тыдні Эўракамісія апублікавала праект стратэгіі «Палітыка эўрапейскага суседзтва», у якой адлюстроўваюцца прынцыпы супрацоўніцтва Эўразьвязу зь яго новымі суседзямі на ўсходзе і на поўдні. Тыя, хто чакаў ад Эўракамісіі больш канкрэтных пляnaў супрацоўніцтва зь Беларусяй, былі зноў расчараваны: далей за звычайную канстатацыю праблем мэмарандум не пайшоў. Беларусь фактычна выключаецца з кола партнэраў Эўразьвязу.

У новай стратэгічнай паперы Эўракамісіі Беларусі ў параўнаньні зь іншымі суседзямі адведзена нязначнае месца. Ствараецца ўражаньне, што Эўракамісія з задавальненьнем абмінула б Беларусь увогуле. Але ж зусім забыцца на існаваньне незалежнай дзяржавы з даўжэзнай супольнай мяжой не выпадала — вось і давялося, як заўсёды, абмежавацца агульнымі фразамі.

Працяг на старонцы 2.

# Ізаляцыя краіны замест ізаляцыі рэжыму



Працяг са старонкі 1.

Як і належыць, умовай больш шчыльнага супрацоўніцтва Беларусі са Зьвязам было названа ўвядзеньне дэмакратычнай формы кіраваньня і правядзеньне вольных і справядлівых выбараў. А пакуль гэтага няма, Эўразьвяз быццам бы мае намер разглядаць шляхі падтрымкі грамадзянскае супольнасьці ў Беларусі.

З патрабаваньнем Эўракамісіі пра вольныя выбары можна толькі пагадзіцца, бо недэмакратычная сыстэма кіраваньня — гэта адна з галоўных перашкод для разьвіцьця краіны. Толькі вось пытаньне ў тым, што да іншых краін-партнэраў Эўразьвяз прымяняе зусім іншыя стандарты. Ну ці ж можна казаць пра «дэмакратычнасьць» Палестынскае аўтаноміі, урад якой знаходзіцца ў руках тэрарыстаў? Альбо пра якую павагу да правоў чалавека можна казаць у выпадку Расеі, дзе ў выніку крамлёўскіх войнаў Чачэнская Рэспубліка страціла чвэрць свайго насельніцтва?

Двайныя стандарты, якія выкарыстоўваюцца Эўразьвязам, наводзяць на думку, што ёсьць іншыя, куды больш важкія прычыны байкатаваньня Беларусі. Галоўная зь іх — Заходняя Эўропа пакуль што не гатова разглядаць Беларусь як незалежную дзяржаву. Эўразьвяз пагадзіўся з існаваньнем расейскае зоны ўплыву на ўсходзе Эўропы, але ў найменшым выглядзе. Гэтай зонай і ёсьць Беларусь. Эўразьвяз, вядома, гэтага ўголас ня кажа, бо нейк няёмка эўрапейскім лібэралам прызнаваць існаваньне ў XXI ст. падзелаў Эўропы на зоны ўплыву ялцінскага тыпу. Але ж злавацць Расею зь яе паталягічна імпэрскім стаўленьнем да Беларусі Эўразьвяз не адважваецца. Вось і даводзіцца Эўракамісіі абмяжоўваецца агульнымі фразамі і абяцаць «разглядзець пытаньні далейшага супрацоўніцтва»… Знаёмы стыль усіх бюракратаў, галоўная задача якіх — «забалбатаць» праблему.

Вось і маем, што замест ізаляцыі недэмакратычнага рэжыму адбываецца ізаляцыя краіны. А як яшчэ можна растлумачыць той факт, што ў праграмах фінансавае дапамогі суседзям Зьвязу Беларусь займае апошняе месца, саступаючы нават такім краінам, як Сырыя ці Ліван? Гэтае ігнараваньне Беларусі ніякім дэфіцытам дэмакратыі не растлумачыць. Для таго каб спрасьціць візавы рэжым, аздараўляць беларускіх дзетак, падтрымліваць незалежную нацыянальную адукацыю або арганізоўваць праграмы абмену паміж сем'ямі, згоды афіцыйнага Менску ня трэба. А такія праграмы і былі б менавіта той падтрымкай дэмакратыі ў Беларусі, якой нам так не стае. Сам факт, што нашу краіну ведаюць, зь ёй лічацца і ўспрымаюць як партнэра, меў бы велізарнае значэньне для разьвіцьця грамадзянскае супольнасьці ў Беларусі. А пакуль што Беларусь пачуваецца як той запозьнены наведвальнік кіно: адшукаць сваё месца ў залі, «свой пачэсны пасад між народамі», замінае цемра, бо фільм ужо пачаўся. А тыя, хто пасьпеў зручна ўсесьціся, крычаць: сыдзі, не замінай!

Але ж розгалас пасьля публікацыі стратэгічнай паперы паказаў, што ня ўсе краіны Эўразьвязу, прынамсі сярод яго новых сяброў, падтрымліваюць ізаляцыю Беларусі. Нашы суседзі ва Ўсходняй Эўропе маюць уласны досьвед існаваньня за жалезнай заслонай і разумеюць шкоду ізаляцыяніцкіх падыходаў для дэмакратыі. Вядома, што Польшча выступае за шырэйшае супрацоўніцтва Эўразьвязу зь Беларусяй. Магчыма, у пашыраным Эўразьвязе ў Беларусі зьявяцца сябры. Гэта будзе азначаць, што пашырэньне Зьвязу мела для Беларусі і станоўчыя бакі.

**Сяргей Вінаградаў**

# Палата прадстаўнікоў не рэкамэндуе прызнаваць выбары законнымі

Рабочая група палаты прадстаўнікоў на чале са старшынём камісіі па правах чалавека, міжнацыянальных адносінах і СМІ Валер'ем Ліпкіным не рэкамэндуе выносіць на абмеркаваньне законапраект аб унясеньні зьмяненьняў і дапаўненьняў у Выбарчы кодэкс. Тым самым зроблены першы крок да непрызнаньня будучага парлямэнту эўрапейскай супольнасьцю.

Ініцыявала прыняцьце паправак да Выбарчага кодэксу нелаяльная ўладам дэпутацкая група «Рэспубліка» яшчэ мінулай вясной, а сам праект у суаўтарстве зь Мечыславам Грыбам напісаў генэрал Валер Фралоў. Праект закону трымаецца на трох кітах: адмена датэрміновага галасаваньня, пашырэньне правоў назіральнікаў падчас галасаваньня і пры падліку галасоў, а таксама абавязковы ўдзел палітычных партыяў у фармаваньні выбарчых камісій усіх узроўняў. Менавіта такіх зьмен ад афіцыйнага Менску патрабуе і Парлямэнцкая Асамблея АБСЭ, ПАРЭ, пагражаючы — пры адмове зьмяніць выбарчае заканадаўства — не прызнаць ні саміх выбараў, ні новага парлямэнту.

**Глеб Хмяльніцкі**




**Суаўтараў законапраекту — генэрала Фралова й трохразовага алімпійскага чэмпіёна Парфяновіча нават не запрасілі на паседжаньне групы. Пра гэта журналісты даведаліся ў сераду на прэс-канфэрэнцыі ля Чырвонага касьцёлу. У Дом ураду журналістаў не прапусьцілі. Валер Фралоў і Сяргей Скрабец абвясьцілі аб скліканьні 21 ліпеня Ўсенароднага сходу, каб «падвесьці вынікі» 10 гадоў кіраваньня А.Лукашэнкі. Спадзяюцца сабраць на сход дзясяткі тысяч людзей з усіх гарадоў краіны.**

# Рада абароны Кобрыню

«Народная воля», паведаміўшы пра існаваньне ў Кобрыні «раённай рады абароны» на чале з старшынём райвыканкаму, намякнула, што, мусібыць, гэткія самыя рады ёсьць у Беларусі паўсюдна, і ўсчала лямант: маўляў, у краіне дэ-факта ўведзена ваеннае становішча. Хацеў бы супакоіць «нарадавольцаў»: ППРБ даўно хацеў мецць сваю палітычную партыю, дык вось ён яе й стварае — пад кансьпіратыўным назовам. А тое, што фінансуецца яна зь бюджэту, дык у самых цывілізаваных краінах збольшага так яно й ёсьць. Так што не панікуйма, спадарства!

**Лявон**

# «Свабодзе» — 50

Беларускай службе радыё «Свабода» спаўняецца 50 гадоў. Віншуем калегаў! Не пакіне нас надзея там, дзе няма цемнаты.

# Іх музыку крадуць




**Ці можа прадавацца аўтэнтычная народная музыка без папсовых прыхарошваньняў? Гурт «Гуда» не баіцца экспэрымэнтаваць на сабе: 25 траўня ён дасьць сольны канцэрт у Тэатры эстрады.**

«Гуда» рэпэтуе ў менскім пэдунівэрсытэце. Шукаючы яе ў тамтэйшых лябірынтах, можна кіравацца на галасы, што поўняць гулкія ўвечары калідоры. Ніякага музычнага суправаджэньня. Ніякіх прыхарошваньняў. Аўтэнтыка і чысьціня.

Працяг на старонцы 12.

ЦЫТАТА

# Руслана Лыжачка: Забудзьце пра Чарнобыль

«Мы ўсе працуем на пазытыўны імідж Украіны. Я хачу, каб Чарнобыль быў забыты».

Украінская сьпявачка Руслана пасьля перамогі на «Эўрабачаньні» 15 траўня.

**МБ; Reuters**



ШТО Ў СЬВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Цэны на нафту: рэкорд 41,85

ЗША разьлічвалі, што перамога ў Іраку прывядзе да патаньненьня нафты. Канфлікт зацягнуўся на два гады, і цэны на чорнае золата зашкальваюць. У панядзелак быў пастаўлены гістарычны рэкорд: 41,85 даляра за барэль т.зв. лёгкасалодкага гатунку. Гэтак біржа адгукнулася на забойства Асмана Мухамэда — кіраўніка часовае іракцкае адміністрацыі. Калі амэрыканцы ня здольныя забясьпечыць ахову аднаго чалавека, як уберагчы сотні кілямэтраў нафтаправодаў?

## Родная мова: «Вэлкам» сьледам за транспартнікамі

Апэратар сотавай сувязі «Velcom» абвясьціў пра адкрыцьцё беларускамоўнае вэрсіі свайго сайту. В.а. гендырэктара кампаніі Мікалай Юшкевіч заявіў, што «запуск беларускай вэрсіі сайту — гэта плянавы, стратэгічны крок кампаніі».

На просьбу ТБМ, у сваю чаргу, адгукнуліся гарадзкія ўлады Берасьця й Гомелю. Праязныя дакумэнты там пачнуць друкаваць на беларускай мове.

Беларуская мова заваёўвае й пазыцыі між школьнікаў. 41.129 выпускнікоў узялі ўдзел у тэставаньні па белмове, тады як па расейскай — толькі 37.689.

## Малдова: апазыцыя зьядналася

Правацэнтрысты стварылі блёк «Дэмакратычная Малдова» на чале з мэрам Кішынэва Сэрафімам Урэкянам для ўдзелу ў выбарах-2005. У яго ўвайшлі альянс «Наша Малдова» на чале з экс-прэм'ерам Брагішам, Дэмакратычная партыя экс-сьпікера парлямэнту Думітру Дзякава і драбнейшыя сілы.

## Эўразьвяз: бяз Бога да парога

На сустрэчы кіраўнікоў МЗС краін Эўразьвязу ў аўторак ізноў абмяркоўвалі тэму ўключэньня ў прэамбулу эўрапейскай канстытуцыі слова «Бог» і адсылкі да «эўрапейскіх хрысьціянскіх вартасьцяў». Гэтага патрабуюць Італія й Польшча, але катэгарычна працівіцца гэтаму Францыя.

## Візыты: толькі з Расеі

Беларускае кіраўніцтва па-ранейшаму можа разьлічваць толькі на гасьцей з Усходу. Саміт краін Эўразійскае эканамічнае прасторы (Беларусь, Расея, Украіна, Казахстан) адбудзецца 23—24 траўня ў Ялце. Расейскі прэм'ер Міхаіл Фрадкоў завітае ў Менск 8—9 чэрвеня. Беларускі пасол у Расеі таксама паведаміў, што візыт Уладзімера Пуціна перад 60-годзьдзем вызваленьня Беларусі ад фашыстаў «ня выключаны». Прынамсі, «няма падстаў, каб расейскі прэзыдэнт адмовіўся ад запрашэньня». Дадамо: запрашэньня паўдзельнічаць у кампаніі перадачы беларускаму лідэру пажыцьцёвых паўнамоцтваў.

## Юбілеі: Монтэ-Касына

Пад Монтэ-Касына скончыліся ўрачыстасьці ў гонар 60-й гадавіны крывавае бітвы за ўзвышша. У складзе арміі Андэрса там загінула й 300 беларусаў. У імпрэзах гэтым разам бралі ўдзел і беларускія дыпляматычныя прадстаўнікі.

## Курапаты: ахоўная зона

Мінкульт выдаў пастанову пра стварэньне вакол Курапатаў ахоўных зонаў. Пастанову падпісалі таксама кіраўнікі Менску й вобласьці Міхаіл Паўлаў ды Мікалай Дамашкевіч. Па ўзгадненьні зь міліцыяй, у суботу дружына БНФ і «Зубра» пачне патруляваць урочышча.

## Гешэфты: «Ліўэрпуль» па цане «Белтрансгазу»

Уласьнікі футбольнага клюбу «Ліўэрпуль» ухвалілі ўгоду аб продажы прэм'еру Тайлянду Таксыну Шынаватрою 30% акцый клюбу за 105 млн даляраў. Такая постындустрыяльная эканоміка: каманда каштуе даражэй, чым МТЗ і МАЗ разам узятыя.

**МБ; БелаПАН**

# Расея ахвяруе Ўкраіне больш, чым Беларусі

**15 траўня Расея адмовілася спаганяць падатак на дабаўленую вартасьць па месцы вытворчасьці на карысьць Украіны, перайшоўшы на прыняты ва ўсім цывілізаваным сьвеце мэханізм — спаганяць ПДВ у краіне прызначэньня. Тым самым Расея губляе 800 мільёнаў даляраў, якія магла б браць з энэргарэсурсаў, якія яна пастаўляе ва Ўкраіну. Не бескарысьліва: узамен за адмову Ўкраіны ад курсу на эўраінтэграцыю і, вядома, толькі ў тым выпадку, калі прэзыдэнтам у кастрычніку будзе абраны Януковіч, а ня Юшчанка. За прадаваныя ў Беларусь энэргарэсурсы Расея па-ранейшаму спаганяе ПДВ у сябе.**

Выканаўчы дырэктар «Белгазпрамбанку» Валер Дашкевіч робіць выснову, што «ў эканамічных стасунках Расея пайшла далей з Украінай, чым зь Беларусяй». «Расея з усімі краінамі СНД гандлюе паводле прынцыпу спагнаньня ПДВ на месцы прызначэньня. Выключэньне рабілася толькі адносна энэрганосьбітаў — ПДВ спаганяўся ў Расеі. Адмовіўшыся ад спагнаньня ПДВ з энэргарэсурсаў па месцы вытворчасьці, Расея пайшла на больш цеснае супрацоўніцтва з Украінай», — гаворыць экспэрт.

Між тым, дасюль за энэргарэсурсы, якія пастаўляюцца ў Беларусь, Расея сама бярэ ПДВ. «Расея ўжо прапаноўвала пераходзіць на прынцып спагнаньня ПДВ у краіне прызначэньня — у Беларусі». Аднак у гэтым выпадку Беларусь мусіць купляць энэрганосьбіты выключна па рынкавых цэнах…», — кажа В.Дашкевіч.

Тым часам «газавая вайна» Беларусі й Расеі ідзе да чарговага абвастрэньня. «Газпром» недвухсэнсоўна запатрабаваў ад афіцыйнага Менску ўзаконіць двухбаковыя адносіны, заключыўшы кантракт на пастаўку расейскага газу ў Беларусь і на транзіт праз тэрыторыю краіны. 18 траўня старшыня праўленьня ААТ «Газпром» Аляксей Мілер назваў і дату ікс — 1 чэрвеня. На наступны дзень беларускі віцэ-прэм'ер Уладзімер Сямашка прадказаў: дамова будзе ў чэрвені.

«Газпром» прапануе два магчымыя сцэнары легалізацыі двухбаковых адносінаў. Абодва былі агучаны вечарам 17 траўня на сустрэчы зь беларускімі журналістамі першым намесьнікам старшыні «Газпрому» Аляксандрам Разанавым. Першы сцэнар прадугледжвае падпісаньне агульнага кантракту — і на пастаўкі расейскага газу ў Беларусь, і на транзіт, які цяпер вядзецца з парушэньнем расейскага заканадаўства — без кантракту. «Газпром» прапануе прадаваць Беларусі тысячу кубамэтраў газу па цане 46,68 даляра ЗША ў абмен на транзытную стаўку памерам 0,68 даляра. Згодна з другім варыянтам, прапануецца заключыць два асобных кантракты. «Газпром» згодны плаціць 1,02 даляра за транзіт расейскага газу па тэрыторыі Беларусі, але зразумела, тады і газ Беларусь будзе купляць па больш высокіх цэнах.

Пастаўкі расейскага газу ў Беларусь па цэнах пятага цэнавога поясу магчымы толькі пры тым, што расейцы называюць «рэальнай інтэграцыяй дзьвюх краін». Згодна з пагадненьнем, якое дзейнічала да канца 2003 г., «Газпром» пастаўляў газ па ўнутрырасейскіх цэнах, спадзеючыся на акцыянаваньне і прыватызацыю «Белтрансгазу». Паколькі Беларусь акцыянаваньне правяла, але прыватызацыі не адбылося, пагадненьне перастала дзейнічаць.

«Асноўная маса транзыту газу праз Беларусь ідзе па трубаправодзе «Ямал—Заходняя Эўропа», які належыць «Газпрому», хаця і абслугоўваецца «Белтрансгазам». Зразумела, з гэтай прычыны плаціць тарыф 1,9 даляра — столькі, колькі «Газпром» плаціць Украіне, — за транзыт газу па ўласнай трубе бессэнсоўна. Калі б труба была беларускай уласнасьцю, тады транзытны тарыф Украіны можна было б прымяняць у Беларусі», — сьцьвярджае Валер Дашкевіч. «Беларусь хоча атрымліваць газ па 47 даляраў, а транзытную стаўку прапануе 1,2. Расея, зразумела, не прымае такіх прапаноў — плаціць украінскія цэны за транзіт па ўласнай трубе. Таму Расея прапануе цану на газ 50—52 даляры, а транзытны тарыф — ніжэйшы», — гаворыць В.Дашкевіч.

Экспэрт ня стаў прагназаваць далейшага разьвіцьця падзей. «Думаю, праблема будзе вырашацца пасьля ялцінскай сустрэчы. Абодва бакі спадзяюцца на сустрэчу Пуціна з Лукашэнкам, якая расставіць кропкі над «і». Да ялцінскай сустрэчы нешта прагназаваць цяжка. Баюся, што Пуцін ізноў заявіць, што гэта — спрэчка суб'ектаў гаспадараньня, якія мусяць дамовіцца між сабой», — зазначыў В.Дашкевіч.

**Глеб Хмяльніцкі**

Віталь Сіліцкі

# Змову замаўлялі?



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Усялякія тэорыі змовы толькі ўзмацняюць у дзяржаве пазыцыі сілавікоў. На здымку — міністар ўнутраных справаў Уладзімер Навумаў.**

Апошнім часам у інтэрнэт-выданьнях у межах і за межамі Беларусі моднай тэмай зрабіліся вэрсіі наконт распрацоўкі варыянтаў адхіленьня прэзыдэнта Лукашэнкі ад улады. У прыватнасьці — пра нейкія змовы ў колах беларускай намэнклятуры, у Маскве і на Захадзе.

У гэтай сувязі прыгадваецца стары савецкі мультфільм «Рабаваньне па-італьянску». Там галоўны герой хадзіў па горадзе, прасіў грошай у доўг і абяцаў аддаць, калі абрабуе банк.

Падобныя вэрсіі, дакладней, спосаб іх падачы, былі б такія ж камічныя, калі б гаворка не ішла пра такія сур'ёзныя рэчы. І ў тым ліку — пра больш чым сур'ёзныя вынікі (гэта не пагроза, а канстатацыя факту) для тых, хто распаўсюджвае гэтыя вэрсіі.

Калі, вядома, нешта падобнае сапраўды мае месца быць. Бо вядома ж, што змова і публічнасьць — рэчы несумяшчальныя. Узмоцнена распаўсюджваныя канцэпцыі адхіленьня Лукашэнкі сьведчаць хутчэй пра актыўную работу па недапушчэньні самой магчымасьці такога разьвіцьця падзей. А значыць, ня шкодзіла б прааналізаваць, што на самай справе выклікала ўсплёск падобных гіпотэз і аналітычных пошукаў.

Першая і самая шалёная думка — нехта вырашыў папярэдзіць прэзыдэнта пра тое, што вакол яго вядуцца падкопы. Але, думаецца, такія папярэджаньні лішнія, незалежна ад таго, ці маюць яны пад сабой грунт. З інстынктам самазахаваньня і пачуцьцем небясьпекі ў нашых улад усё ў парадку.

Другая думка: усё гэта — спроба падштурхнуць некага вельмі ўплывовага і вельмі нездаволенага беларускімі ўладамі да актыўных дзеяньняў. Пераканаць, што трэба толькі заскочыць на падножку цягніка, паравая топка якога ўжо набіта палаючымі дровамі.

Гэта нагадвае стары савецкі анэкдот пра тое, навошта палітбюро галоснасьць абвясьціла. Маўляў, каб за адзін раз выявіць усіх нязгодных і зэканоміць на рабоце спэцслужбаў.

Вось, напрыклад, адзін з тэзысаў, які падаецца ў публікацыях як аксіёма: «Амаль усе ўнутраныя і знадворныя палітычныя групы ў той ці іншай ступені зацікаўлены ў зьмяненьні правілаў гульні». Відаць, аўтары такіх радкоў ці дрэнна ведаюць Беларусь, ці выдумляюць гэта для тых, хто сам у нашай сытуацыі нічога не разумее.

У Беларусі сапраўды поўна груп, у тым ліку і ўнутры сыстэмы, якім цяперашнія правілы гульні абрыдзелі. Але іх наўрад ці можна назваць палітычнымі і тым больш уладнымі, якія валодаюць рэальным уплывам і здольнасьцямі зьмяніць палітычны расклад.

Пра што гэта я? Ды пра тое, што наша краіна ўжо даўно арганізавана паводле прынцыпаў паліцэйскай дзяржавы, у якой ролю галоўных наглядчыкаў выконваюць сілавыя структуры. Іх уладныя паўнамоцтвы ва ўсіх навідавоку. У адрозьненьне ад, скажам так, выхадаў на бізнэс. Ці трэба вялікім людзям з гэтых сфэр мяняць існыя правілы гульні — пытаньне амаль што рытарычнае. А вось тое, што ўсялякія тэорыі змовы толькі ўзмацняюць у дзяржаве пазыцыі сілавікоў, несумненна.

Трэцяя думка — што тут мае месца элемэнтарная схватка бульдогаў пад дыванам. Дакладна вядома, што самы дзейсны спосаб выкапаць яму для якога-небудзь беларускага чыноўніка — распаўсюдзіць чуткі, што менавіта ён зьяўляецца пераемнікам прэзыдэнта, ядром кансалідацыі намэнклятурных сіл, фаварытам Крамля і г.д.

Прозьвішчы, якія фігуруюць у падобных аналітычных выкладках, добра вядомыя. Калі думка пацьвердзіцца, дык мы, хутчэй за ўсё, зьяўляемся сьведкамі канкурэнтнай барацьбы ўнутры апарату. Што само па сабе для назіральнікаў цікава, але ад чаго наўрад ці можна чакаць якіх-небудзь значных палітычных вынікаў. Рэч у тым, што гульні падобнага роду заўсёды ўзмацняюць, а не аслабляюць пазыцыі першай асобы. Калі ўнутры дзяржаўнага апарату і існуюць магутныя групоўкі, дык падобныя схваткі вядуць толькі да іх узаемнага аслабленьня.

Нарэшце, думка чацьвёртая. Нам неаднаразова заяўлялася, што прэзыдэнт пойдзе на трэці тэрмін у тым выпадку, калі апанэнты пачнуць «вастрыць нажы» і рыхтаваць расправу над ягонымі паплечнікамі. Аўтар гэтых радкоў яшчэ год таму папярэджваў: чакайце правакацый, і не адной.

Працэс, відаць з усяго, ужо пайшоў, акурат праз некалькі дзён пасьля празрыстых папярэджаньняў у ходзе штогадовага пасланьня. Спачатку — два ствалы Міхаіла Марыніча (арсэнал проста ўражальны). Потым — паказаная па дзяржаўных каналах чарговая прапагандысцкая агітка «Дарога ў нікуды». Пераказваць яе ня мае сэнсу. Калі гэтая вэрсія пацьвердзіцца, дык застанецца толькі прымаць стаўкі на тое, калі на беларускіх тэлеканалах зьявіцца яшчэ адзін прапагандысцкі фільм на тэму змовы супраць Лукашэнкі.

Усе вышэйпадзеяныя развагі грунтуюцца не на падазрэньнях аўтара, а на простай лёгіцы пошуку адказаў на пытаньне «Каму гэта выгадна?». Як бачым, распаўсюджваньне тэорый змовы выгадна перш за ўсё іх патэнцыйным аб'ектам.

Адміністрацыйна-прапагандысцкая машына ўжо дастаткова адладжана, каб функцыянаваць у рэжыме паказальных працэсаў 1937 г. Няхай і з мякчэйшымі прысудамі, але з зусім падобнымі абвінавачаньнямі і самавыкрыцьцямі (што, дарэчы, ужо і паказала справа Марыніча).

У такой сытуацыі ўяўляецца рэалістычным толькі адзін з прагназаваных варыянтаў разьвіцьця падзей — сілавое ўтрыманьне ўлады. У некаторым сэнсе ён ужо даўно рэалізуецца. І ўздзел у ім добраахвотных памочнікаў выклікае адно горкую ўсьмешку.

**www.naviny.by**

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

3 траўня ў Асіповічах супрацоўнік КДБ спрабаваў завэрбаваць актывіста «Зубра» **Міхала Н.**, затрыманага за расклейку ўлётак зь лягатыпам арганізацыі. Кіраўнік АГП **Анатоль Лябедзька** 12 траўня быў аштрафаваны на 100 базавых велічынь (1 млн 900 тыс. руб.) за ўдзел у «Чарнобыльскім шляху». **Нізавая арганізацыя** Беларускага прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці, аўтамабілебудаваньня, мэталаапрацоўкі й іншых галін народнай гаспадаркі (РЭПАМ) на менскім заводзе «КБДЭМОМА» 12 траўня гвалтам пераведзена ў афіцыйны Беларускі прафсаюз работнікаў прамысловасьці. 12 траўня **Ўладзімера Леванеўскага** аштрафавалі на 95 тыс. руб. за распаўсюджваньне друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак. Суд Салігорску 13 траўня апраўдаў сяброў АГП **Ларысу Алешку**, **Марыю Воўчак**, **Аляксея Прыходзьку**, **Яўгена Валодзьку** і **Зьмітра Ларыёнава**, затрыманых 7 траўня за ўдзел у акцыі «Хочам ведаць праўду». 14 траўня ў Магілёве падчас распаўсюду газэты «Час» затрымалі старшыню абласной філіі АГП **Уладзімера Шанцава**. Лідэру Агульнанацыянальнага страйкаму прадпрымальнікаў **Валер'ю Леванеўскаму** тэрмін зьняволеньня падоўжаны на два месяцы: яго зьвінавацілі ў публічнай зьняваге Аляксандра Лукашэнкі. 17 траўня менская друкарня «Сьветач» адмовілася друкаваць незалежную **«Новую газету Сморгони»**. Менскі гарадзкі суд 17 траўня адхіліў касацыйную скаргу Беларускага кангрэсу незалежных прафсаюзаў на рашэньне суду Цэнтральнага раёну Менску аб справядлівасьці звальненьня былога кіраўніка Менскай абласной арганізацыі прафсаюзу работнікаў культуры **Ўладзімера Мамонькі**. 16 траўня ў Барысаве падчас распаўсюджваньня зарэгістраванай газэты ТБМ «Наша слова» былі затрыманы 6 актывістаў «Зубра»: на **Паўла Мікуловіча** і **Алеся Казакова** склалі адміністрацыйныя пратаколы за распаўсюд выданьня без выходных зьвестак. **Партыя БНФ** 18 траўня падала ў суд на вядучага праграмы «Ў цэнтры ўвагі» Юр'я Пракопава (25 красавіка ён ляпнуў, што БНФ адменіць усе льготы чарнобыльцам, калі прыйдзе да ўлады) і начальніка аддзелу інфармацыі Маларыцкага райвыканкаму Сяргея Строка (27 красавіка на сустрэчы дэпутата райсавету Ўладзімера Малея з выбарцамі ён заявіў, што БНФ у час вайны супрацоўнічаў з фашыстамі).

Пачалася грамадзкая кампанія ў абарону Міхаіла Марыніча. З мэтай вызваленьня вязьня асабістыя паручэньні за М.Марыніча адвакату перадалі Сяргей Балыкін, Валер Фадзееў, Сьвятлана Калінкіна, Жанна Літвіна, Уладзімер Ганчарык, Міхаіл Пастухоў.

**АШ**

# Немаўлятак перавязуць у Віцебск

**Гэтую аршанку можна сьмела заносіць у кнігу рэкордаў Гінэса. Маладзіца нарадзіла ды здала дзяржаве на ўтрыманьне ажно 15 (!) дзяцей.**

Ворша — рэкардсмэн у Беларусі ня толькі па колькасьці вязьніцаў ды зьняволеных на душу насельніцтва, але й па колькасьці ўстаноў апякунства. Іх у горадзе чатыры: дом немаўляці (дзеткі да 3-х гадоў), дзіцячы дом (для дашкольнікаў) і дзьве школы-інтэрнаты. Большасьць выхаванцаў усіх гэтых установаў — сіроты пры жывых бацьках. Ёсьць і «падкінутыя» дзяржаве матулямі-«зязюлямі». Адну зь іх можна сьмела заносіць у кнігу рэкордаў Гінэса. Маладзіца нарадзіла ды здала дзяржаве на ўтрыманьне ажно 15 (!) дзяцей. Вядома, ад розных татаў. «Ці вінаватая я, што мяне мужчыны так кахаюць?» — кажа маці-«гераіня». Але ў найбліжэйшы час Аршанскі дом немаўляці, якому, дарэчы, споўнілася ўжо 85 гадоў, будзе зачынены. Рашэньне аб гэтым прыняў Віцебскі абласны цэнтар гігіены і эпідэміялёгіі, бо будынак установы не адпавядае сучасным патрабаваньням. Дзетак, а іх тут каля сарака, плянуецца перавезьці ў Віцебск. Асобных нехта захоча ўсынавіць. Збольшага апошнім часам маленькіх гаротнікаў бяруць на выхаваньне іншаземцы. Праўда, ім дазваляюць вывозіць з краіны выключна дзяцей з ЗПР, алігафрэнаў (іх тут хапае, бо ў асноўным бацькоўскіх правоў пазбаўляюць алькаголікаў ды розных сацыяльна-небясьпечных асобаў). Летась, напрыклад, з 12 усыноўленых 8 паехалі да новых бацькоў у ЗША, Швэцыю, Ірляндыю.

Закрыцьцё дому немаўляці вельмі хвалюе калектыў установы. І не таму, што шмат хто страціць працу. Невялікі кантынгент выхаванцаў робіць Аршанскі дом немаўляці ўтульным, больш падобным на сямейны. А ў тым жа Віцебскім доме немаўляці гадуецца звыш за 150 дзяцей. Для гарадзкіх уладаў, наадварот, будзе пэўная палёгка, бо зьнікне яшчэ адна сацыяльная ўстанова, на ўтрыманьне якой заўжды не хапае грошай, ды вызваліцца ладны двухпавярховы будынак у цэнтры гораду, які хутка знойдзе заможнага гаспадара.

**Яўген Жарнасек, Ворша**


АРТУР ПРУПАС

# Хлябанава з Кортні Лаў


WWW.RICCARDOGAY.COM

Самая вядомая ў сьвеце беларуская топ-мадэль Кацярына Хлябанава зьнялася ў фатасэсіі са скандальнай амэрыканскай сьпявачкай Кортні Лаў.

Паводле інфармацыі газэты «New York Post», на здымках для часопісу «Dutch», дзе існуе рубрыка накшталт «мадэль+зорка», Хлябанава і Лаў жарсна цаваліся. А на адным з фатаздымкаў удава Курта Кабэйна смокча палец беларускі. Пасьля Кортні Лаў прапанавала Кацярыне правесьці разам ноч, але Хлябанава адмовіла. Кажа, што аддае перавагу мужчынам.

Гэта першы скандал, зьвязаны зь беларускім мод-бізам на сусьветным узроўні. Але ж імя беларускі Хлябанавай ужо досыць вядомае. Яна прымала ўдзел у паказах ад Джорджа Армані і дому «Крыстыян Дыёр». «Аднойчы Армані шукаў Кацю па ўсёй Італіі, каб запрасіць у адзін са сваіх паказаў. Так і не знайшоў, бо яна была тады ў Нью-Ёрку», — кажа Сяргей Нагорны, кіраўнік агенцыі, дзе пачынала Хлябанава.

Праўда, убачыць тую фатасэсію пакуль нельга. «Гэта не адпавядае мэнтальнасьці беларусаў», — кажа Нагорны. Дый маці Хлябанавай да таго ж строга кантралюе яе публікацыі.

**Сяргей Трафілаў**

## Гісторыю пачынаем з 1941-га

Памятны знак кіраўніку сялянскага паўстаньня XVIII ст. Васілю Вашчылу праз адсутнасьць сродкаў усталяваны ня будзе. Пра гэта ў размове з кіраўніком Крычаўскай арганізацыі «Народнай грамады» паведаміў намесьнік старшыні райвыканкаму Сяргей Марозаў. Прапанова знайсьці сродкі па-за бюджэтам прадстаўнікоў улады адхілена. Маўляў, усе грошы павінны быць накіраваны на рамонт помнікаў героям вялікай айчыннай вайны і стварэньне Алеі герояў.

Пісьмовае абяцаньне сп.Марозава паспрыяць ушанаваньню памяці славутага земляка было атрымана летась, пасьля звароту крычаўскіх сацыял-дэмакратаў у выканкам. Да звароту былі далучаны подпісы некалькіх соцень крычаўцаў.

**Кацярына Яленская, Крычаў**

## Крыжа на іх няма

Ведалі, куды ішлі, невядомыя зламысьнікі. Уначы яны ўзламалі дзьверы царквы Раства Хрыстова ў Івацэвічах і абрабавалі яе: прыхапілі з сабой посуд, сталовыя прыборы, фарбу і рэлігійныя кніжкі.

Непажаданыя госьці ўжо ў другі раз наведваюцца ў гэты храм. У першы раз яны пакваліліся на крыж, дзьве Бібліі і гітару. Пасьля гэтага выпадку давялося паставіць краты на вокны, аднак яны не дапамаглі.

Вернікі моляцца за грэшнікаў і чакаюць іх раскаяньня.

**Алесь Лаўранюк, Івацэвічы**

ІНАКШ КАЖУЧЫ

# Дагары нагамі, альбо Высакародны каўбой Джо

Віталь Тарас


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Нядаўна мне давялося пісаць пра плякат, які я бачыў на сваё вочы амаль у самым цэнтры Менску. На агромністым рэклямным стэндзе — велізарны мэдаль з выяваю Сталіна й надпіс «За адвагу». Кампазыцыя прысьвечана тэме 60-годзьдзя «вызваленьня Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў». Мне падалося, што плякат ня толькі ўтрымлівае фальш (бо на мэдалі «За адвагу» няма партрэту правадыра). Гэткая «вонкавая агітацыя», на маю думку, зьневажае памяць мільёнаў ахвяр вайны, якія трэба аднесьці на сумленьне як Гітлера, так і яганага даваеннага хаўрусьніка — «архітратэга» Сталіна.

І вось на адным з інтэрнэт-форумаў выпадкова патрапіў на вочы водгук на маю публікацыю. Нейкі малады чалавек — людзі старога веку наўрад ці бяруць удзел у «форумах» — з сарказмам гаворыць, што калі б нацыяналісты прыйшлі да ўлады, дык адразу б зьнесьлі помнік Перамогі. Маўляў, нічога сьвятога ў цяперашніх «нацыяналістаў» і «дэмакратаў» не засталося — нават Перамогу разам са Сталіным гатовы перакрэсьліць. Мне падалося цікавым паспрабаваць зразумець лёгіку маладога пакаленьня — прынамсі, тае яе часткі, думкі якой выказвае невядомы мне ўдзельнік дыскусіі.

Мне здаецца, што менавіта на гэтае пакаленьне, якое ведае пра вайну хіба што зь фільмаў кшталту «Вызваленьня» і «17 імгненьняў вясны», падсьвядома разьлічваюць улады. Сапраўдных удзельнікаў вайны праз 10 год амаль не застанецца. Зрэшты, нічога пра яе ня ведаюць, бадай, і тыя, хто сёньня вырашыў усталяваць у беларускай сталіцы стэнд з выявай Сталіна. Для іх гэта кшталту «каўбоя Мальбара» з рэклямы цыгарэтаў, гэткі модны брэнд нашага часу. Сталін — гэта таксама свайго роду каўбой, анкл Джо (як яго называлі на Захадзе) — рэспэктабэльны дзядзька з характэрным тварам: высакародная сівізна, ласкавая ўсьмешка хаваецца ў пажаўцелых ад тытуню вусах, хітра прыжмураныя вочы, пранікнёны мудры позірк. Адным словам — правадыр. Амаль што як Садам Хусэйн. Ці бэн Ладэн, які «паказаў» гэтым «амэрыкосам».

Дарэчы, я ня ўтрырую. Адзін беларускі анархіст апантана даводзіў мне, што Лукашэнка — хаўрусьнік левакоў і ўвогуле антыглябалісцкага руху, паколькі ён выступае супраць амэрыканскага імпэрыялізму. Трэба думаць, папярэднікамі ў гэтай барацьбе былі «тата Док», Пол Пот, а таксама былы імпэратар-людажэрац Бакаса, які быў вялікім сябрам Леаніда Брэжнева.

Але ж я вельмі далёка адышоў ад тэмы. У разважаньнях маладога чалавека на інтэрнэт-форуме мяне зацікавіла ня тое, што ён ставіць на адну дошку Перамогу і Сталіна, а што ён сьвядома аддзяляе слова «нацыяналізм» (незалежнасьць Беларусі) ад слова «Перамога». І робіць гэта цалкам слушна. Паколькі сталінская Перамога — а менавіта так і толькі так дзесяцігодзьдзямі падавалася яна ў падручніках і мастацкіх творах — ніколі не атаясамлівалася зь незалежнасьцю й свабодай. Усьлед за вызваленьнем ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Беларусь вярнуўся сталінскі прыгнёт. Адно рабства зьмянілася на другое. Дзень незалежнасьці не выпадкова быў перанесены шляхам маніпуляцыяў на 3 ліпеня. Абсалютна дакладна, як у Оруэла: свабода — гэта рабства. Прыгнёт — гэта Вызваленьне. Незалежнасьць у складзе саюзнай дзяржавы.

Сымбалем такой «незалежнасьці» і такога «вызваленьня» можа быць толькі Сталін. І Лукашэнка. Але партрэты Лукашэнкі памерам з каўбоя «Мальбара» пакуль яшчэ публічна не выстаўляюцца — мабыць, час яшчэ не прысьпеў. Замест яго выстаўляецца партрэт Сталіна. Гэты партрэт замяняе адразу ўсе партрэты членаў палітбюро ЦК КПСС, а таксама бюро ЦК КПБ, якія вывешваліся падчас дзяржаўных савецкіх сьвятаў. Гэта свайго роду пароль, сыгнал усім «братам па крыві»: «Сталінград» ужо быў, цяпер толькі наперад — на Захад. Вораг будзе разьбіты, перамога будзе за намі…» І ўсялякая іншая ідэалягічная лухта. Можна верыць у яе, можна ня верыць. Галоўнае, ведаць — *іх* час яшчэ ня скончыўся. Як казаў герой адной старой пароды, у якога сын запытаўся, ці быў 37-ы год, — не, ня быў, сынку, але будзе…

Зразумела, усе сымбалі шматзначныя. У свастыцы можна бачыць старажытны індыйскі сымбаль, і толькі. І не ўспамінаць, што пад гэтым знакам нацысты зьнішчалі мільёны габрэяў, палілі беларускія вёскі разам з жыхарамі. І наадварот, можна, як гэта зрабіла галоўная прэзыдэнцкая газэта, напісаць, што народ нібыта не прыняў гербу «Пагоня» і бела-чырвона-белага сьцяга, таму што іх, маўляў, выкарыстоўвалі калябаранты. Як быццам і не было да гэтага многіх вякоў гісторыі Беларусі. Можна ў Сталіне бачыць, напрыклад, героя анэкдотаў. Магчыма, для многіх маладых людзей сёньня і Чэ Гевара, і Фідэль Кастра, і Сталін — усяго толькі сымбалі эстэтыкі мінулае эпохі, якая можа падацца нават рамантычнай. Магчыма. Але са спадчынай Чэ Гевары й зь Фідэлем хай разьбіраюцца самі жыхары Выспы Свабоды. А вось спадчына Сталіна зусім побач — у Курапатах, на вуліцах Менску, у падручніках па дзяржаўнай ідэалёгіі. Сапраўды, ідэі Сталіна—Леніна жывуць і перамагаюць.

Абэліску Перамогі, прынамсі, сёньня нічога не пагражае. Ля «вечнага агню» стаіць ганаровая варта актывістаў-бэзрэсэмаўцаў. І Курапаты мясцовыя ўлады, нарэшце, зь неахвотай, але ўсё ж дазволілі патруляваць маладым валантэрам. Каму й чаму пакланяцца, якому Богу маліцца — гэта праблема выбару, якую кожнае пакаленьне вырашае пасвойму. Тыя, хто ляжаць у брацкіх магілах, тут не дапамогуць. Як любілі паўтараць прапагандысты 70-х, «гэта трэба ня мёртвым, гэта трэба жывым».

P.S. Гэта толькі ў «краіне Мальбара» каўбоі выглядаюць здаровымі й мажнымі хлопцамі. У сапраўднасьці паленьне небясьпечнае для вашага здароўя.

# Як быць папулярным

## Новыя тэхналёгіі айчыннага шоў-бізу

**Канстанцін Драпеза сам цягае кайстру з дыскамі. Слава Корань адмовіўся несьці найлепшы альбом году на FM-станцыі. «J_Морс» дае VIP-канцэрты. Хлястову не пашанцавала з тварам. Афанасьева й Піт Паўлаў разьдзеліся на фатакамэру.**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Фэстываль «Beatles Forever», 15 траўня, Менск. Выступ Тэатру модаў засьведчыў папулярнасьць нечаканых дуэтаў.**

Хоць ганарары айчынных зорак утрая меншыя, чым у зорак расейскіх ці ўкраінскіх, і дыскі айчынных выканаўцаў не разыходзяцца стотысячнымі накладамі, але па продажах у Беларусі «Крамбамбуля» і «N.R.M.» ужо не саступаюць Зэмфіры ці «Фабрыцы зорак».

Чуў нядаўна ў кавярні размову двух людзей гадоў 30-ці. Адзін кажа: вось, пайшоў прыдбаць новы альбом Шаўчука ды выпадкова пабачыў дыск з прыкольнай назвай «Крамбамбуля». «Па-беларуску, а клёва!» — «Я ў тэлевізары яе кліп бачыў — сьмешны!» — адказвае другі. У гэтай кароткай гутарцы адбіліся асноўныя трэнды беларускага музычнага рынку. Адзін зь іх — выхад на масавага слухача. Раней новы альбом таго ж Кулінковіча можна было адшукаць толькі ў знаёмых у тройчы перапісаным варыянце. Літаральна летась беларускі музычны бізнэс выйшаў на іншы ўзровень: беларускую музыку можна набыць у любой дыскарні, колькасьць такіх крамак вырасла, хай пакуль толькі ў Менску, а вялікія стэнды з анонсамі канцэртаў разьмяшчаюцца ў цэнтры гораду.

Рок-музыка камэрцыялізуецца, і канцэрты айчынных зорак ператвараюцца ў сапраўдныя шоў. Паралельная праца ў некалькіх праектах таксама спрыяе папулярнасьці: імёны музыкаў трымаюцца на слыху. Зрабіў сваю справу і загад міністра інфармацыі аб 50%-м напаўненьні радыёэтэру беларускай прадукцыяй. Што да тэлевізіі, то й без загадаў, дзякуючы энтузіязму некаторых супрацоўнікаў, беларуская музыка знайшла сваё месца ў сетцы вяшчаньня («Кліп-абойма», «Кропка»). Ужо можна казаць аб правілах айчыннага шоў-бізу і перадумовах посьпеху. Іх восем.

### «Крамбамбуля» vs «Крама»

Галоўны — наяўнасьць у калектыве штатнай адзінкі прадусара. У гэтым выпадку музыканты складаюць зь сябе абавязкі па арганізацыі выступаў, перамоў са спонсарамі, выдумваньні цікавостак ды займаюцца непасрэдна сваёй справай. Прыклад — «Крамбамбуля». У «Крамбамбулі» прадусарскімі справамі займаюцца ажно чатыры чалавекі — у выніку праект стаўся найбольшым камэрцыйным посьпехам у сучаснай музычнай гісторыі.

Антыпрыклады — «Крама», «Гарацкія», Аляксандра і Канстанцін. Гэтыя выканаўцы самі сабе прадусары. Таму іх песьні не гучаць у FM-этэры, што ў іх не стае часу занесьці дыскі, іх выступы падобныя адзін да аднаго, а дыскі прадаюцца слабавата. Перад «Эўрабачаньнем» апошнімі заняўся генпрадусар БТ Максімкаў, але пасьля эўрафіяска Канстанцін Драпеза, відаць, ізноў будзе сам перапісваца з прэсай, дамаўляцца наконт канцэртаў ды цягаць з сабой кайстру з дыскамі…

### Вайцюшкевіч vs Саладуха

Жаночая частка аўдыторыі ўспрымае выканаўцу празь яговы выгляд, а мужчынская частка — праз IQ. Дурні ня ў модзе. Слухачы самі вызначаюць «лепшасьць» выканаўцы. Прыкладам, Вайцюшкевіч на канцэртах нешматслоўны. Музыка складае ўражаньне прыгажунаінтэлектуала: абавязковае хаджэньне па залі з раздорваньнем кветак жанчынам, дапаўняюць карціну рамантычная музыка і інтэлектуальная паэзія Камоцкага.

Антыпрыклад — Саладуха: грубы, хіжы (з выгляду), нягалены і самазакаханы. Кпіць з Саладухі ўжо сталася дрэнным тонам — хай сьпявае, калі яму падабаецца.

### «Тэзаўрус» vs Хлястоў

Дрыгаснасьць у дачыненьні да сусьветнай сцэны не праходзіць. Рэклямаваць сябе як «беларускі «Oazis» — заведамы правал. Затое непаўторнасьць узводзіць на беларускую вяршыню нават лянівых.

Напрыклад, Стэфан (падобна, што з эстрадай ён завязаў) выконваў два простыя патрабаваньні — неназойлівасьць музыкі (аранжыроўкі Лявона Шырына) і захаваньне індывідуальнасьці сьпевака. Цяпер на ролю адметнасьці можа прэтэндаваць «Тэзаўрус». Калі яны зробяць стаўку на свае баляды, на «Новы Ерусалім» забудуцца.

Антыпрыклады — «Partyzone», Аляксей Хлястоў. Хлопцы з «Partyzone» вырашылі зьмясьціць на вокладцы свайго «дэбютніка» выказваньне Міколы Ваўранюка пра «беларускі «Rammstein» з усьмешкай у душы», на гэтым, уласна, збудаваўшы рэклямную кампанію. Сякую-такую папулярнасьць яны здабылі, толькі вось публіка на іхніх канцэртах патрабуе прасьпяваць што-небудзь з «Rammstein'у». Хлястову проста не пашанцавала — надта ён падобны на Глызіна. Вось і даводзіцца яму змагацца з гэтым параўнаньнем усімі сіламі. Можа, па-беларуску засьпявацы?

### «J_Морс» vs «Уліс»

Важны складнік — добрыя адносіны з прадстаўнікамі прэсы. Прэсухі ў розных месцах з фуршэтамі, раздаваньне, з пэўнымі інтэрваламі, эксклюзіваў, запрашэньні ў госьці, званкі позна ўвечары дадому з просьбай паслухаць новую песьню адразу па тэлефоне — гэта ўсё мацуе адносіны з журналістамі. Раней ці пазьней у іх зьявіцца адчуваньне, што яны нечым абавязаны выканаўцу.

Прыклад — «J_Морс». Імідж такой «свойскай» групы, абяцаньні беларускамоўнай публіцы выдаць у хуткім часе альбом па-беларуску, VIP-канцэрты для сяброў і журналістаў. Даволі гнуткая палітыка прадусара і гітарыста групы Рамана Арлова дала свой плён — твар Пугача не зьнікае са старонак прэсы, прычым праяў непрыязнага стаўленьня да «J_Морс» з боку пішучай брацыі заўважана не было. Вынік — беспрэцэдэнтнае для Беларусі перавыданьне самотніка «Вэб-дызайн». Дагэтуль посьпеху міні-альбомаў у нас не давалі веры.

Антыпрыклад — «Уліс». Выпакутаваны дыск «Люстэрка» ня тое што ня быў прэзэнтаваны — нават прэсканфэрэнцыі не было. Так што прадукт прайшоў міма слухача, хоць рэальна прэтэндаваў на званьне «Найлепшы альбом-2003». Паказальная фраза Кораня: «Упэўнены, што на FM-станцыях «Уліс» бы ставілі, проста я не хачу туды ісьці».

### «По глазам» vs «Нэйра дзюбель»

«Прынцып Курэйчыка»: давесьці мясцоваму люду, што ты ўжо прызнаны па-за межамі краіны. Маўляў, Табакоў засьведчыў ужо цікавасьць да нашага прадукту… Так дзейнічае «По глазам». Кажуць, што ў гэтай маладой альтэрнатыўнай каманды не абы-якія сувязі з прадусарамі Масквы й Кіева: маўляў, пісаліся ў Ступкі на грошы Фадзеева. Таму група й мае зоркавы арэол, хоць новым матэрыялам ды яркімі канцэртамі падмацаваць свой статус ня можа.

Антыпрыклад — «Нэйра дзюбель». Пасьля няўдачы з прасоўваньнем групы ў Расеі Кулінковіч настойвае на тым, што яму краёў чужых ня трэба.

### «Ляпіс Трубяцкой» vs Сяржук Труханoвіч

Рэклямная прадукцыя: прыгожанькія флаеры, якія даюць іх уладальнікам перавагу над астатнімі (у музычнай краме — зьніжка, напрыклад), плякаты (чым большыя, тым лепей), каляндарыкі, значкі, футболкі з сымболікай гурту. Акцэнт на густоўнае аздабленьне (асабліва калі гэта дэбютны дыск). Выява можа стацца стрыжнем піяру. Прыклад — «Ляпіс Трубяцкой». Калектыў ужо некалькі год дзейнічае як самаакупная творчая адзінка. Раней ім дыктавалі свае ўмовы гуказапісвальныя кампаніі, а цяпер «Ляпісы» зьмянілі сытуацыю ў адваротны бок.

Антыпрыклад — Сяржук Труханoвіч. Попыт на інструмэнтальную музыку невялікі, але гітарыст «Крамы» і «Палацу» аздабленьнем свайго апошняга дыску «Нараджэньне таямніцы» рызыкуе зьнізіць яго да нуля.

### Афанасьева vs «Сьвята»

Элемэнт скандальнасьці й «жаўціні», прысутнасьць у сьвецкіх рубрыках. Агульны прынцып — калі ты пажадаў стаць зоркай, мусіш быць падрыхтаваны да таго, што ў тваёй бруднай бялізне будуць корпацца. Праўда, беларуская сьвецкая хроніка яшчэ захоўвае цнатлівасьць: далей за навіны пра тое, што адзін партугалец набыў дыск «Крамбамбулі» за 300 эўра, гаворка не ідзе. Хіба што грамадзкасьць даведалася, што Міхалок двойчы быў жанаты, а сапраўднае прозьвішча Вольскага — Зэйдэль. А разьдзеліся на фатакамэру пакуль толькі Афанасьева й Піт Паўлаў. Затое абое — рашуча.

### І так бясконца

Часовае аб'яднаньне выканаўцаў у дуэт, трыё, супольны праект ды перапяваньне старых шлягераў на новы лад. Гэты пункт быў засвоены айчыннымі выканаўцамі па максымуме. Таму супольныя праекты ў нас самыя прадавальныя. Імі Беларусь наелася, люд патрабуе зорных дуэтаў. Хочаце? Наце. Афанасьева і Смольскі, Карыяна і Нілс, Варашкевіч і Аляксандра. Але не стае такім дуэтам сэнсацыйнасьці, за выняткам пары Мірны — Алеся. Праўда, ідуць Вольскі з Скрыпкам.

**Сяргей Будкін**

# У «Тэзаўрусе» было два крымінальнікі

## Мікола Пташнікаў: Мы прынялі веру й зьмяніліся


Мікола Пташнікаў быў асыстэнтам у вядомага менскага гітарнага майстра Ўладзімера Мілуна. І гэтую гітару яны рабілі разам.
АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Даўно ў беларускай папулярнай музыцы не было Зьявы. Усе яе чакаюць. Прамільгвае зьнічка, а потым аказваецца, што гэта нешта штучнае («Сябры, медавуха, касьцёр») ці другаснае («Бяру будзільнік, кідаю ў халадзільнік», — раўлі «клоны» адной нямецкай групы). Заяўка на адметнасьць ізноў пададзена — гурт «Тэзаўрус» выдаў першы дыск і рыхтуецца паказаць сваю праграму 26 траўня. З гітарыстам і бэк-вакалістам «Тэзаўрусу» Міколам Пташнікавым мы сустрэліся ля 9-й бальніцы — ён наведваў жонку Аксану, якая крыху прыхварэла. Ніштo ў Мікалаю не выдавала яго прыналежнасьці да цяжкарокавай каманды — звычайны хлопец з кароткай стрыжкай, не брыдкасловіць і ня паліць, прамаўляе нягучна…

**«НН»: «Тэзаўрус» іграў сярод маладых камандаў на фэсьце «Генэралы айчыннага року», на Вашых афішах пазначана «Самы выбуховы дэбют-2004». Між тым, вы не такія ўжо і зялёныя пачаткоўцы…**

**Мікола Пташнікаў:** Сапраўды. Граем ужо сем год. Спачатку зваліся «Армагедон», але зусім нядаўна вырашылі зьмяніць найменьне, бо зашмат, як высьветлілася, камандаў з такой назвай — у адной толькі Расеі налічыў тры.

**«НН»: Нешта зьмянілася разам з назвай?**

**М.П.:** Не, галоўныя зьмены ў жыцьці ўдзельнікаў каманды адбыліся крыху раней. На пачатку ў нашай групе было два крымінальнікі (рабавалі кватэры, наколькі мне вядома) і наркаман. Сам я калісьці цікавіўся чорнай магіяй і нават дасягнуў некаторых посьпехаў у гэтым кірунку (напрыклад, авалодаў унушэньнем). Жыў тады ў Бабруйску, неяк убачыў абвестку, што пратэстанцкая царква шукае гітарыста. Паставіўся з усьмешкай, але на падсьвядомым узроўні нешта спрацавала — сасьніў неяк жахлівы сон, дзе сярод рыкаў пачвар прабіваецца голас, што прамаўляе: «Езус Хрыстус!». Так я прыняў веру, пачаў іграць хрысьціянскі рок, набраў у групу хлопцаў з вуліцы. Але і яны зь цягам часу зьмяніліся і сталіся вернікамі.

**«НН»: Такі лёгкі шлях ад крымінальніка да верніка? Што паўплывала на гэтых людзей? Казані? Музыка?**

**М.П.:** Царква, да якой мы адносіліся, часьцяком ладзіла экскурсіі па Беларусі — «Па сьлядах Вітаўта», напрыклад, ды іншыя, прысьвечаныя розным гістарычным падзеям. Ды яшчэ агульная атмасфэра нашых выступаў — вось тое, пэўна, што паўплывала на ўдзельнікаў групы. Да таго ж прыйшло ўсьведамленьне таго, што трэба сьпяваць па-беларуску. Як выявілася, мы занялі вольную нішу ў беларускай музыцы.

**«НН»: Так, беларускамоўнай пратэстанцкай музыкі да «Тэзаўрусу» не было чуваць. Але існуе шмат расейскамоўных выканаўцаў — Даўкш, Брыкса, «Новы Ерусалім».**

**М.П.:** Мы ўсе робім адну справу. Але мова — гэта важна. Мы хочам давесьці, што нацыя ня можа квітнець ня толькі безь веры, але і безь мовы, гісторыі, культуры. Таму я ўдзячны Вітаўту Мартыненку, які пераклаў на беларускую некалькі тэкстаў групы, напісаў колькі новых.

**«НН»: Шыкоўная баляда «Тэзаўрусу» пад назвай «Ерусалім» напісана на вершы Барадуліна.**

**М.П.:** Мы запрасілі Рыгора Барадуліна на адну з рэпэтыцыяў. Прыйшоў ён з Камоцкім, праслухаў і сказаў, што яму падабаецца. Потым адмыслова для нас напісаў яшчэ адзін верш. Увасобім яго. Увогуле ж, наша кола не абмяжоўваецца вернікамі. Мы й не імкнемся да хрысьціянскай тусоўкі, разьлічваем на ўсялякага слухача, якому магло б быць блізкім паняцьце «тэзаўрус».

**«НН»: А што для вас «тэзаўрус»?**

**М.П.:** Агульная скарбонка нацыі — вера, мова, гісторыя, культура. Бяз гэтых рэчаў нацыя непаўнавартасная. Такі сэнс назвы нашага альбому «Аднова тэзаўрусу».

**«НН»: Дзе, для каго, як часта грае «Тэзаўрус»?**

**М.П.:** Буйных канцэртаў было няшмат — утрапёна працавалі над дыскам. Ігралі ў клюбах — гэта важна для росту. Канцэрт 26 траўня ў «Рэактары» — самы сур'ёзны наш сольны выступ. Мы рыхтуем пастановачнае шоў, каб было цікава ня толькі слухаць, але й глядзець.

А ўлетку паедзем на буйны хрысьціянскі рок-фэст «Song of Songs» у Торунь (Польшча), дзе аўдыторыя 20 000 гледачоў. Падалі заяўку разам з «Новым Ерусалімам» на ўдзел у вялікім хрысьціянскім фэсьце «Масты любові» ў ЗША.

**Размаўляў Сяргей Будкін**

Прэзэнтацыя альбому «Аднова тэзаўрусу» адбудзецца 26 траўня ў клюбе «Рэактар». Пачатак а 19-й. Квіткі каштуюць 7 (танцпол) і 10 (столікі).

## Аднова тэзаўрусу

Тэзаўрус, 2004

Альбомы, якія выпакутоўваліся гадамі, песьціліся, бы дзіцянё, чуваць зь першых гукаў. «Аднова тэзаўрусу» — адзін зь іх. Якасна, проста і сучасна: цікавыя аранжыроўкі, дзе разам з драйвавымі гітарамі ўплецены клявішныя (часам нагадвае творчасьць фінскіх хлопцаў «HIM») і скрыпка. Асноўнае пасланьне альбому — у першым трэку: «Аднаві тэзаўрус — гэта твой ключ і храм». І не такімі ўжо цяжкарокавымі аказаліся 17 песень «Тэзаўрусу» пры бліжэйшым разглядзе. Асноўны козыр музыкаў — лірычныя рок-баляды. Файна атрымалася б у хлопцаў беларуская вэрсія «Jesus Christ Superstar»!

# Гамон — шоўбіз

## ТОП-10 слэнгу беларускага шоў-бізнэсу

«Беларускі шоў-бізнэс разьвіваецца папартызанску», — кажа Віталь Супрановіч з «БМА-group». «Нам і так усім гамон», — сьцьвярджае на канцэртах Лявон Вольскі. Генэралы і партызаны айчыннага року ды прэсы — пра слэнг беларускае сцэны.

**Гамон** — поўны гамбец. Было ўведзена ў беларускі шоў-бізнэс дзякуючы песьні-ляманту «Нам усім гамон!» — самаму кароткаму гіту «N.R.M.». Лявон Вольскі кажа, што слова цалкам натуральнае. Яго выкарыстоўваюць у некаторых беларускіх гаворках, адкуль яно і трапіла ў песеньку. Але ж на канцэртах на прапанову фэнаў пракрычаць гэты гіт Вольскі нярэдка адказвае: «Нам і так усім гамон!»

**Генэралы** — абагульненая назва найлепшых беларускіх рок-гуртоў. Раней, у залатыя часы «Рок-каранацыі», іх называлі каралямі. Назва замацавалася пасьля фэсту «Генэралы айчыннага року». Арганізатар шоў Віталь Супрановіч кажа, што слова «генэралы» досыць умоўнае. Аднак падчас прамоўшану канцэрту маладыя гурты-канкурсанты былі аднесены да «лейтэнантаў», таму ўмоўнасьць можа зрабіцца традыцыяй. Дарэчы, слова прыдумаў музычны журналіст Вітаўт Мартыненка.

**Дыскарня** — музычная крама. Слова атрымала вялікае пашырэньне пасьля шэрагу рэклям плыткі Зьміцера Вайцюшкевіча «Паравіны году» ў «НН». Паходжаньне — паводле аналёгіі са словамі «кавярня» і «кнігарня».

**Каза** — канцэртная заля «Менск». Мікола Шакель, рэдактар «Студэнцкай думкі», кажа: «Мы называлі залю «Менск» «казой» яшчэ ў часы майго студэнцтва — годзе ў 1997-м». Але ж у шырокі ўжытак слоўца ўвайшло пасьля сэрыі супэрпасьпяховых беларускіх канцэртаў за апошнія паўгоду. Пасьля першага зь іх — выступу «Крамбамбулі» — «НН» выйшла з загалоўкам на першай старонцы: «Каза стаяла на рагах».

**Лявонка** — трасянка ўдзельнікаў гурту «N.R.M.» падчас канцэртаў. Модны наватвор фанатаў. Сп.Вольскі, у чый гонар і названа фірмовая мова, ні сном ні духам пра такую фішку. На просьбу пракамэнтаваць слова «лявонка» ён адказаў: «Як жа я магу камэнтаваць тое, пра што ня ведаю. Вы мне адкрываеце новыя далягляды!»

**Партызаны** — фанаты «N.R.M.» у рок-тусоўцы, а ў шырокіх колах — прыхільнікі беларускай музыкі наогул. Паводле слоў Віталя Супрановіча з «БМА-group», найперш гэтае азначэньне пайшло ад песьні «Партызанская» гурту «N.R.M.», аднак вытлумачыць яго можна яшчэ й неразьвітасьцю наскага шоў-бізу. А Лявон Вольскі нават і не думае крыўдаваць на такое характарызаваньне сваіх фэнаў: «Называюць — ну і добра!»

**Плытка, кружэлка** — беларускія адпаведнікі слову «кампакт-дыск». Слова «кружэлка» было досыць папулярнае яшчэ за савецкім часам і адносілася да вінілавых дыскаў. «Плытка» было перанята з польскай мовы як адказ расейскаму «пластинка». У слэнг айчыннага шоўбізу патрапіла зь лёгкае рукі Аксаны і Анатоля Вечараў праз праграму БТ «Кліп-абойма».

**Самотнік** — беларуская адаптацыя ангельскага «single». Калі выходзіў першы беларускі «самотнік» — аднайменная плытка «N.R.M.», казалі, што слова было знойдзена ледзь ня ў нейкіх архівах. Сёньня Вольскі кажа, што гэта проста добры і дасл‌оўны адпаведнік. За беларускім самотнікам №1 зьявіліся такія ж праекты ў «Ляпіса Трубяцкога», «Крамы». Ёсьць ужо і максы-самотнік ад «J_Морс».

**Супэр** — скарот ад прозьвішча акулы беларускага шоў-бізнэсу, прадусара Віталя Супрановіча. Сп.Віталь зусім не крыўдуе на журналістаў і музыкантаў, што называюць яго такім чынам. Ён жа сапраўды супэр!

**Шоў-біз** — скарот ад «шоў-бізнэс». У актыўны ўжытак слова ўведзена часопісам «Студэнцкая думка». Але ж рэдактар выданьня Мікола Шакель зазначае, што «CD» толькі адаптавала слова да беларускае глебы. Сам жа такі скарот пайшоў зь Вялікае Брытаніі.

**Сяргей Трафілаў**

# 700 даляраў за чатыры хвіліны

## Як у Беларусі здымаюць кліпы

**Відэакліп — гэта маленькі кінафільм. З паўнафарматным кіно ў нас праблемы — «Слуцкая» недацягнула, «Акупацыю» забараняюць, — а вось кліпы здымаюцца ці не штодня. Пяць гадоў таму ў Беларусі было тры спэцыялісты-кліпмэйкеры, цяпер іх лік пайшоў на дзясяткі. У ратацыі «Першага музычнага каналу» знаходзіцца каля сотні кліпаў айчынных музыкаў. Маладыя ўсьведамляюць, што відэаўвасабленьне іх гіту — адзін з галоўных чыньнікаў раскруткі. Але, зь іншага боку, такое мастацтва вымагае выдаткаў, якія могуць і не акупіцца.**

Здымкі відэакліпу дуэту «Аляксандра і Канстанцін» на кампазыцыю «Мой Галілей», якую яны прасьпявалі 12 траўня на «Эўрабачаньні», абышліся ў добрую капейчыну. Прадусаваў кліп асабіста генэральны прадусар БТ Уладзімер Максімкаў. Аўтарам ідэі і рэжысэрам кліпу выступіў Максім Носаў. У здымках бралі ўдзел рыцары клюбу «Ордэн Паўночнага храму», каскадзёры з трукавага тэатру Вячаслава Аркунова і клюбу каскадзёраў «Дуал дэнс» ды дзясятак актораў. «Нармальнае кіно можна зьняць і за чатыры тысячы даляраў», — сказаў у адным з інтэрвію рэжысэр мастацкага фільму «Акупацыя» А.Кудзіненка. Колькі ж каштуе зьняць нармальны кліп?

### Так было

Відэасуправаджэньні да песень пачалі здымаць яшчэ ў 70-я. Так, тэлерэжысэр Валер Пестаў стварыў у Беларусі ролік да песьні «Я — робат» (выконвалі Аляксандар Чарнаўскі і Ўладзімер Мацецкі) ў сьнежні 1973 г. — першы такога роду прадукт ва ўсім СССР. Натуральна, што здымалі на стужку «Песьняроў», «Верасоў». Як правіла, гэта былі кароткамэтражныя дакумэнтальныя фільмы.

Мода ж на сапраўдны кліп — як вобразнае ўвасабленьне музычнага твору — распачалася пры канцы 80-х. Першапраходцамі сталі рокеры — менавіта тады зьявіліся відэашрагі да песень «Бонды», «Мясцовага часу», «Мроі» і «Ўлісу». Першаму кліпу — на бондаўскую песьню «Ура» ўжо шаснаццаць гадоў. Тады рэжысэры асабліва не напружваліся: «цьвік» сюжэту зтаданага кліпу — людзі, што скачуць з вокнаў. Увогуле ўрбаністыка была ў модзе. Кліп «Мроі» «Я рок-музыкант» зьнялі менш чым за гадзіну на будоўлі аднаго з гмахаў па вул.Харужай позна ўвечары. А вось музыканты наваполацкага «Мясцовага часу» бязь лішняе сьціпласьці здымалі кліп на песьню «Мой дом» у Сафійскім саборы. Як згадвае гітарыст «МЧ» Валер Драко, «прараліся» яны ў храм таксама ўначы, залагодзіўшы заўхоза (!) некалькімі бутэлькамі гарэлкі. Сёньня аўдыёвізуальная мода зусім іншая, і тыя кліпы выклікаюць хіба гістарычную цікавасьць.

### Дзьве прэм’еры на тыдзень

Кацярына Нявінская вядзе ў БДУ спэцкурс кліпазнаўства, які доўга і нудна называецца «Відэакліп у структуры аўдыёвізуальнай камунікацыі». Шырокаму гледачу-мэлямана яна больш вядомая з супольнай працы з гуртом «Крамбамбуля»: гэта тая самая «незнаёмка з «Абсэнту». Павелічэньне колькасьці кліпаў яна тлумачыць перш за ўсё пашырэньнем мэдыйнай прасторы. Так, у праграме Беларускай тэлевізіі «Кліп-абойма» 2-3 прэм’еры на тыдзень. Болей за 100 кліпаў знаходзіцца ў ратацыі «Першага музычнага каналу». Круціць іх на ТВ бясплатна. Цяпер амаль кожны музыкант разам са сваім альбомам ці сынглам выпускае кліп. Хоць як рэклямны ход гэта можа і не спрацаваць. Напрыклад, альбом Ларысы Грыбалёвай, кліпу якой на песьню «Што-небудзь» ня бачыў толькі той, хто ня мае тэлевізара, значна саступае ў продажах дыску Аляксея Хлястова, які кліпаў ня мае. Бо «кліп — гэта сродак стварэньня інфармацыйнага поля вакол сябе, ня больш за тое», — кажа К.Нявінская.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Здымкі кліпу на новую — нават ня цалкам яшчэ дапісаную — песьню гурту «J_Морс» «Так-цік-так» у менскім бары «Эльдарада». Прасьпяваная яна пабеларуску. У якасьці актора ў кліпе здымаецца музыка і радыё-ды-джэй Слава Бандарэнка (на здымку — з сурвэткай).**

Рэжысэр Анатоль Вечар мяркуе, што грошы, патрачаныя на кліп, папросту не вяртаюцца, таму прыстойны кліп могуць дазволіць сабе адно заможныя музыкі.

### Ганарары — ад соткі да тысячы

Самыя дарагія айчынныя рэжысэры — Уладзімер Янкоўскі і Ігар Пашкевіч. Янкоўскага можна назваць звышэстэтычным рэжысэрам: ён надае вялікую ўвагу дэкарацыям, касьцюмам актораў, здымае ўсё «з размахам». Адна з найбольш паказальных яго працаў — кліп на песьню Лікі Ялінскай (яшчэ не Агурбаш) «Папяровы месяц» — прыгожая і багатая тэлепастаноўка з дэкарацыямі і прафэсійнымі акторамі. Гэта адзін зь нешматлікіх айчынных кліпаў, зьнятых на кінастужку.

Для Ігара Пашкевіча, які вядомы па кліпах Аляксандра Саладухі, «Ляпіса Трубяцкога», «Палацу», «Лепрыконсаў», а таксама як сурэжысэр мастацкага фільму «Армія выратаваньня», важны перадусім аповед, сюжэт, які выгодна спалучаецца з рэклямай выканаўцы.

Ганарары Янкоўскага і Пашкевіча складаюць па некалькі тысяч даляраў. Сярэдняя ж рэжысэрская стаўка — 100—200 у.а. Кліпмэйкеры, як правіла, — прафэсійныя рэклямісты ці тэлерэжысэры (БТ, тэлестудыі «Валідыя», «Ака») — асобна такой спэцыяльнасьці не існуе. «Кліпмэйкер — гэта звод прафэсій», — кажа К.Нявінская.

Кінарэжысэры ў нас кліпаў зазвычай не здымаюць. Хоць аднойчы кліпмэйкерам ледзьве ня стаў Пташук. Ён меўся зьняць ролік на песьню Анатоля Длускага «Я вярнуўся зь пекла», але справа не пайшла.

Сярод самых важных айчынных кліпмэйкераў можна назваць яшчэ Аляксандра Шульгу. Ён прадукуе кліпы ўзьнёслыя, што добра ілюструе яго супольная з «Новым Ерусалімам» «Любоў у далонях». Уладзімер Маркевіч («Новае Неба», «Крыві», «Крамбамбуля») можа выдатна перадаць настрой песьні і не баіцца экспэрымэнтаў. Ну, і самыя вясёлыя кліпмэйкеры — Аляксей Хацкевіч і Мацей Сабураў («Саша і Сірожа», «Крамбамбуля-1,5», «Ляпіс Трубяцкой»). Самы эканомны рэжысэр — Алег Чацьверыкоў (зрабіў апошнія два кліпы гурту «Стокс»): ён намагаецца зьняць толькі патрэбныя кадры. У Анатоля Вечара — іншы мэтад: шмат нездымаць і выбраць самае цікавае.

### Іншыя выдаткі

Другая крыніца выдаткаў у кліпмэйкерстве — носьбіт відэаінфармацыі. Здымаць на кінастужку могуць сабе дазволіць толькі зоркі са спонсарамі, бо адна бабіна яе каштуе 600 даляраў (каб зьняць кліп, трэба 2-3). Варта яшчэ ўлічыць тое, што праявіць і апрацаваць такую стужку ў Беларусі няма магчымасьці — трэба ехаць у Маскву ці ў Прагу. Кінакліпы на дарагой стужцы здымалі Ліка і Саладуха. А большасьць працуе ў лічбавым тэлефармаце. Касэта для лічбавай камэры каштуе 8—10 даляраў за гадзіну запісу. Здымаюць дзеля некалькіх хвілін 10—15 гадзін. Вось і выходзіць, што пры самых сярэдніх выдатках на кліп патрэбна 600—700 даляраў. Сюды яшчэ ўваходзіць ганарар апэратару (каля 100 даляраў), выдаткі на транспарт, рэквізыт, тэхнічныя прылады (200—300 даляраў), мантаж (100 даляраў). Калі выдаткі сплянаваць так, выйдзе нешта накшталт «Паміж Менскам і Рымам» («Стокс»). Многае залежыць ад важнасьці кліпу, ад патрабаваньняў рэжысэра, актораў і іх ганарараў, таму бюджэт роліку можа дасягаць і перасягаць бюджэт «нармальнага кіно». Прыклад таму — кліп «Вася п’е» («Нэйра Дзюбель»), што рабілі «на Маскву», і «Мой Галілей» для «Эўрабачаньня».

### Канвэер

Ніхто не займаўся пагадовым падлікам кліпаў і адсочваньнем адпаведных тэндэнцыяў, але відавочна, што колькасьць кліпаў ад году да году расьце. Вытворчасьць пастаўлена на канвэер. Так, БТ супольна з «Радыюс-FM» ладзіць акцыю «Найлепшае аўдыё — у найлепшае відэа». Штомесяц паводле вынікаў галасаваньня вызначаецца найлепшая песьня, якая будзе ўвасоблена ў кліп. Такім чынам у лютым быў зьняты відэашэраг да песьні «Мантэвідэа» групы «J_Морс», а пры канцы сакавіка выйшаў кліп на песьню «Пара дамоў» дуэту «Аляксандра і Канстанцін», «Piano» Зьмітра Вайцюшкевіча.

Мастацтва пайшло ў народ: кліпы робяць ня толькі ў Менску — у Баранавічах і Берасьці таксама навучыліся здымаць «танна і сярдзіта». Кліп «Ноч» баранавіцкай групы «Peresprite» некалькі тыдняў трымаўся ў лідэрах «Кліп-абоймы», як і творы берасьцейскага рэжысэра Ўладзімера Ёдава на песьні каманды «Дай дарогу».

**Сяргей Будкін**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Найлепшыя кліпы

**Экспэрт — Кацярына Нявінская, выкладчыца спэцкурсу «Відэакліп у структуры аўдыёвізуальнай камунікацыі»; вядучая «Кліп-абоймы»:**

«Сярод апошніх найбольш якасная — праца Аляксандра Шульгі на песьню «Новага Ерусаліму» «Любоў у далонях». Удалая работа, смачна змантажаваная. Рэдкі прыклад, калі відэа і аўдыё спалучаюцца гарманічна. Кліп Алега Чацьверыкова на песьню «Стоксаў» «Яшчэ адзін раз» я таксама вылучаю для сябе, бо ў рэжысэра атрымалася стварыць музыкантам імідж (такая «лёгкая бамжаватасьць»), які пачаў працаваць па-за кліпам. Апошнюю працу Анатоля Вечара («J_Морс», «Мантэвідэа») я лічу яго найлепшым кліпам. Бо на здымках можа выявіцца, што музыканты ня маюць аўдыёвізуальнай канцэпцыі, г.зн. папросту невядома, як яны мусяць выглядаць на экране. Вечару ўдалося з годнасьцю вырашыць гэтую праблему. У кліпе «Аранжавае сонца» групы «Краскі» падкупае прастата. Прыгожа глядзяцца, без прэтэнзій на нешта высокамастацкае, кліпы груп «По глазам» і «Stereoтыпы». Яны найперш модна змантажаваныя».

## Кліпы-рарытэты

На сайце www.smotritel.com з 10 да 16 траўня адбылася рэтраспэктыва беларускіх музычных кліпаў. Штодня выкладаецца новы рэдкі кліп, які можна скачаць абсалютна бясплатна. Пачалася рэтраспэктыва першым беларускім кліпам «Ура!» (1988) гурту «Бонда». Акрамя таго, у праграму ўвайшлі кліпы гуртоў «Доктар Маро», «Мроя», «Пані Хіда», «Gods Tower». Усе кліпы можна скачаць на сайце.

# Шоў–біз ірвецца ў раёны

**60–70% накладу айчынных дыскаў разыходзіцца ў сталіцы. Рэальны кошт білета для «няменскага» канцэрту — усяго 5000 руб. Аднак «Крамбамбуля» перацячэ ў рэгёны ўжо сёлета! Рок-канцэрты айчынных выканаўцаў зьбіраюць вялікія залі, альбомы «генэралаў» разыходзяцца тысячамі экзэмпляраў, бігборды іх канцэртаў абжылі мэтро. Беларуская рок-музыка камэрцыялізуецца. Толькі вось за менскай кальцавой дарогай пра гэта ня ведаюць. Бо існуюць як мінімум тры праблемы.**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Апошні па часе музычны прарыў за Менск: фольк-фэст «Таўкачыкі» ў Любані (Меншчына). Кульмінацыя Юраўскага абраду: музыкі качаюцца па расе, каб жыта ўрадзіла. З караваем — арганізатар фэстывалю Юры Выдронак.**

## Праблема першая. Сетка распаўсюду

Музычны прадусар, кіраўнік «БМА-group» Віталь Супрановіч кажа, што дыскі айчынных выканаўцаў папросту не даходзяць да рэгіёнаў, бо не адладжана сетка распаўсюду. «Рэгіянальным распаўсюднікам значна лягчэй прадаць звычайную танную зборку песень Сярдзючкі, чым яе ж ліцэнзійны альбом. Калі ж мы размаўляем пра беларускую музыку, якая скрозь ліцэнзійная, дык дадаецца тое, што айчынныя выканаўцы наагул значна менш вядомыя за межамі Менску», — лічыць Зьміцер Бескаравайны, кіраўнік аддзелу маркетынгу кампаніі «Вэстрэкардз-плюс», якая зь нядаўняга часу распаўсюджвае разам зь ліцэнзійнай расейскай музыкай і дыскі айчынных выканаўцаў. Маўляў, ніхто з распаўсюднікаў ня хоча рызыкаваць і «пераплачваць», таму і абіраюць яны разрэклямаваных расейскіх поп-зорак у таньнейшых выданьнях.

Калі б айчынныя гуказапісвальныя кампаніі і дыстрыб'ютары мелі сетку фірмовых крамаў у рэгіёнах, гэта дало б магчымасьць прапаноўваць шырэйшы асартымэнт. І новыя альбомы даходзілі б да слухачоў за Менскам не пасьля дваццатай замовы, а адразу пасьля рэлізу. «Але ж попыт на мэйнстрымавую беларускую музыку паступова расьце», — дадае сп.Бескаравайны.

Паводле ацэнак «Вэстрэкардзу», з айчынных выканаўцаў найбольшым посьпехам у рэгіёнах карыстаецца «Крамбамбуля», пасьля — «N.R.M.» ды «Нэйра Дзюбель» і толькі затым — расейскамоўная папса накшталт Хлястова ды Грыбалёвай. У абласных цэнтрах, як правіла, ёсьць 2—4 шапікі, дзе можна набыць гэтыя ды шэраг іншых беларускіх запісаў. Для абласнога гораду 50—70 прададзеных дыскаў аднаго выканаўцы — гэта ўжо шалёны попыт. Паводле слоў кіраўніка незалежнай Магілёўскай інфармацыйнай сеткі Алеся Асіпцова, менавіта так разыходзяцца дыскі супольных праектаў і «N.R.M.» у яго горадзе. У Полацку і Наваполацку сытуацыя значна горшая: як кажа арганізатар фэсту «Рок-кола» Сяргей Анішчанка, там наагул беларускай музыкі не знайсьці. Натуральна, што ў Менску, дзе чатыры айчынныя тэлеканалы, дванаццаць FM-станцый, некалькі дзясяткаў газэт, сетка музычных крамаў, «прасунуць» новы дыск прасьцей. Таму 60—70% накладу, як правіла, разыходзіцца ў сталіцы.

Цікава, што прыкладна ў такой жа прапорцыі разыходзяцца ў сталіцы й тыражы незалежных газэтаў.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Прадусар Віталь Супрановіч, бацька «Генэралаў айчыннага року», часам ня грэбуе й чорнай шоў-бізнэсовай працай: сам расклейвае афішы.**

## Праблема другая. Выдаткі

Каб канцэрт у рэгіёне акупіўся, квіткі мусяць каштаваць яшчэ болей, чым у Менску. Ці, прынамсі, ганарар у музыкаў павінен быць меншы. Праблема тут ня толькі з жытлом і харчаваньнем. Гурту, каб якасна адыграць «ужывую», прыходзіцца цягнуць апаратуру зь Менску, бо мясцовая рэдка бывае належнай якасьці. А гэта — дадатковыя выдаткі. Да ўсяго, зь нядаўняга часу было ўведзена т.зв. «гастрольнае пасьведчаньне». Цяпер за права правядзеньня канцэрту з аўдыторыяй да 1000 чалавек арганізатар мусіць выдаткаваць у дзяржаўны бюджэт каля 500 000 руб.

А калі білеты задарагія, ёсьць вялікая імавернасьць, што канцэрт пройдзе для арганізатараў у «мінус». Бо чым даражэйшы квіток — тым меней народу прыйдзе. Паводле слоў Супрановіча, найбольш рэальны кошт білета для «няменскага» канцэрту — 5000 руб., больш рабіць рызыкоўна. У Менску ж цэны сягаюць ад 8000 да 35000 рублёў.

Рок-зоркі, якія могуць сабраць у сталіцы аўдыторыю ў некалькі тысячаў, у іншых гарадах арыентуюцца на клюбныя выступы, якія зьбіраюць сотню слухачоў. Прынамсі, менавіта столькі прыйшло на «N.R.M.» у Мазыры. Хоць, як зазначае Лявон Вольскі, гэта было выключэньне, бо сакавіцкае турнэ групы прайшло досыць пасьпяхова: «У Мазыры ўжо проста ніхто не даваў веры, што выступ адбудзецца, бо пяць разоў нашы канцэрты ў гэтым горадзе адмянялі-пераносілі».

На выступленьне «Нэйра Дзюбелю» ў наваполацкім клюбе прыйшло яшчэ меней — 60 чалавек… Ганарар музыкантаў часьцяком залежыць ад колькасьці прададзеных квіткоў. Адпаведна — рызыкуюць і музыкі, і арганізатары. «Грошы за канцэрт сталічнага выканаўцы адбіваюцца вельмі рэдка», — зазначае Сяргей Анішчанка. У траўні Аніса мяркуе наладзіць у Наваполацку, пры падтрымцы мясцовай мэрыі, вялікі рок-фэст пад адкрытым небам. Вядзе перамовы зь вядучымі сталічнымі музыкантамі, якім гатовы аплаціць дарогу ды забясьпечыць жытло і харч. Але ня болей. Бо сродкаў — няшмат. Так, «Рок-кола», што прайшло ў лютым у Полацку і Наваполацку, абышлося Анісе... у 300 даляраў.

## Праблема трэцяя. Рэклама

У Менску паступова наладзілася рэклямная сетка: інфармацыя пра канцэрт распаўсюджваецца праз усе магчымыя каналы. У правінцыі гэтая дзялянка распрацаваная досыць слаба. На сайтах беларускіх музыкаў часьцяком можна пабачыць зьдзіўленыя камэнтары прыхільнікаў: «А што, вы былі ў нашым горадзе?»



**Яўген Калмыкоў: Маскву ўзялі, наступны бар'ер — менская кальцавая дарога.**

«Я мяркую гэтаксама, як і Лявон Вольскі: рэгіянальныя канцэрты — гэта лятарэя. Аднойчы на канцэрт у Пінску на нас прыйшло чалавек дваццаць, бо ў горадзе амаль адсутнічалі афішы. Праз нейкі час мы зноў давалі канцэрт там — заля была цалкам запоўнена», — кажа Аляксандар Кулінковіч. Боязь ёсьць і ў прадусара самага пасьпяховага айчыннага праекту «Крамбамбуля» Яўгена Калмыкова. Ён згадаў яшчэ турнэ па Беларусі «Ляпіса Трубяцкога» (апошні раз — два з паловай гады таму). Тады дырэктар «Ляпісаў» прыйшоў да высновы, што выступаць лепей за межамі краіны, бо тут атрыманыя грошы зусім не пакрываюць затрачаных высілкаў. Але посьпех «Крамбамбулі» ўсё ж падахвоціў прадусараў праекту паказаць яго ўсёй краіне. Калмыкоў кажа: хацелі зладзіць турнэ ўжо ў траўні, ды не знайшлі часу. Але цягам наступных месяцаў «Крамбамбуля» выедзе за Менск.

**Сяргей Будкін**





Тэкст і фота Андрэя Лянкевіча

# Слухалі Зямлю

У апошні дзень folk-modern фэсту «Таўкачыкі на «Юр'я» быў рэканструяваны сам юраўскі абрад. Гэта адбылося ў вёсцы Ператок Любанскага раёну. Атмасфэру аўтэнтыкі стваралі жыхары і госьці, апранутыя ў беларускія строі; сялянскія, упрыгожаныя кветкамі коні; мэлядычныя дзявочыя сьпевы, дзеці, што гушкаліся на арэлях у гаі. Надвор'е спрыяла: ішоў дождж, і атмасфэра нерэальнасьці ненавязьліва плыла ў паветры.

Распачаўся абрад з сустрэчы Юр'і: вясна пад акампанэмэнт дзіцячых сьпеваў, што даносіліся зь бярозавага гаю, назірала, як Юры Выдронак ператвараўся ў сапраўднага паганскага бога. Маладыя дзеўкі пераапранулі яго ў льняную кашулю, на галаву надзелі вянок зь першых вясновых красак. І на белым кані Юры паехаў у вёску. Вяскоўцы падарылі богу ўрадлівасьці каравай. Пад веснавыя песьні людзі накіраваліся да сьвятога каменя, дзе кожны паабяцаў зрабіць нешта добрае. Конь раптам вырваўся з гаспадарскіх рук і паляцеў у поле. Духі продкаў узрушана плакалі. Сьпевы ліліся, дождж не спыняўся. Юры басанож пайшоў па маладым жыце. Тры разы павярнуўся вакол сябе, трымаючы каравай над галавой. Дзеўкі вадзілі карагод. Бабулькі сьпявалі. Юры лёг на расу. Слухалі Зямлю. Дзеўкі скакалі. Хацелася плакаць.

15-мэтровы стол чакаў на вуліцы. Усё аўтэнтычнае: салёныя агуркі, сыр, тварог са сьмятанкай, сальца, бульбу елі рукамі, салаты — лыжкамі. Паспрабаваў выцерці сурвэткай лыжку: «Эх, гарацкія....». Пілі пракіслы бярозавік. Кавалак каравая атрымаў кожны. Увечары быў канцэрт і застольле з ухой.







Даніла Жукоўскі


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

# Чытайце «День», каб не настала ноч?

## У абарону калябарантаў і здраднікаў

Не хвалюйцеся, гэта не рэклама, а крытыка. І гарадзенскі «День», пераемнік традыцый «Пагоні», выходзіць па-беларуску, хай сабе «наркамаўкаю», і рэклямны слоган прыдуманы не супрацоўнікамі выданьня: для газэты, якая не прадаецца ў шапіках, але мае пяць тысяч накладу, рэкляма — наўрад ці першачарговы клопат.

Пагартаўшы некалькі нумароў «Дня», я адчуў, кажучы высокім стылем, неперапможнае жаданьне выказацца на заўсёды актуальную тэму свабоды творчасьці. У сёньняшнім беларускім — зноў жа высокім стылем — дыскурсе ўсякага кшталту свабода заўжды супрацьпастаўляецца канкрэтнаму палітычнаму праекту. Атрымліваецца ўстойлівая пара з загадзя вызначанымі адмоўным і станоўчым пэрсанажамі. Трэба зрабіць намаганьне, каб адрозьніць у дыскусіі пра межы дазволенага ў «калябаранцтве» адвечныя матывы, вызваліць спрадвечную праблематыку ад палітызаванай канкрэтыкі.

У асяродзьдзі людзей, якія працуюць у сфэры беларускай культуры, раскол: адны рашуча або паціху рушылі да дзяржаўнае кармушкі, другія — рашуча або паціху — адмовіліся ад гэтага гонару. Некаторыя, як Віктар Шніп, памкнуліся былі адначасова ў абодва бакі, але мусілі выбіраць, бо напружаньне паміж хаўрусамі занадта вялікае. Найвышэйшы ўзровень зацятасьці прадэманстраваў Васіль Сёмуха, публічна зрабіўшы прыкрасьць «ЛіМу» адмовай ад дармовай падпіскі на «холдынгавае» выданьне.

«День» і «Советская Белоруссия», якія я выпадкова гартаў у адзін дзень, уносяць у малюнак чорна-белага супрацьстаяньня нечакана густыя шэрыя адценьні. Газэты, пры ўсёй фармальнай рознасьці, надзіва падобныя ў зададзенасьці асьвятленьня праблем. Кірунак у абодвух выпадках вызначаецца пазыцыяй улады, толькі ў апазыцыйным «Дні» яна бярэцца з адмоўным знакам. Глыбіня аналізу абмежаваная імкненьнем захаваць ідэалягічную чысьціню, што дасягаецца, як заўсёды ў такіх выпадках, цаной ператварэньня праблемы ў комікс, дзе ёсьць адно «нашы» і «ня нашы», або, як зусім нядаўна любілі цытаваць, «чэсныя» і «нячэсныя».

Параўноўваючы незалежную гарадзенскую газэту з галоўным афіцыёзам краіны, цяжка адпрэчыць пытаньне, як стасуецца да згаданае вышэй палярызацыі аднолькава сьціплы ўзровень тэкстаў, якія яднае астранамічная адлегласьць ад сусьветных узораў (яны дзякуючы Інтэрнэту даступныя сёньня як ніколі раней). Калі нейкі з бакоў мае рацыю, даводзіць яе на культурным полі (да якога хацелася б залічваць і газэты таксама) лепш не пратэстамі, а хоць бы нейкімі дасягненьнямі.

Недаўменьне выклікае не толькі зьмесціва газэтных паласаў. Праглядаючы «Дзеяслоў» і «Маладосць», нельга адказаць, што тут апраўдвае Сёмухаву эмацыйнасьць, бо «Дзеяслоў» ні на парадак ня лепшы за «Маладосць». Нічога не знаходзіцца і ў апраўданьне Шніпавага апартунізму (эвалюцыю стваральніка «сабачых гісторый» цяжка пазначыць больш мяккім словам), бо «Маладосць» ні на парадак ня лепшая за «Дзеяслоў». Ці да месца тая палярызацыя, гэтакія жарсьці, калі з аднаго боку малачытэльная проза і з другога — таксама і абсалютную большасьць тэкстаў можна лёгка пераставіць зь незалежнага ў холдынгавы часопіс і наадварот? Што «калябарацыя», што «супраціў» даюць на літаратурнай ніве надзіва аднолькавыя вынікі.

Клеймаваць «калябарантаў» было б нашмат ямчэй, маючы ў актыве пару гучных назваў ці, яшчэ лепш, імёнаў. Зрэшты, выдатны твор, на які зьвярнула б увагу грамадзкасьць, надаў бы сэнс любой пазыцыі. Кніга ці кінафільм, пра якія гавораць, часопіс, які імкліва набраў годны тыраж (і ня шляхам рассылкі або ведамаснае падпіскі), карацей кажучы — гучнае імя. Гэткі аргумэнт на доўгі час суцішыў бы спрэчкі.

Спробы адолець вяршыню папулярнасьці рабіліся неаднойчы: «Краіна Беларусь», Андрэй Курэйчык, непісьменны блякбастэр «Настасься Слуцкая»… Усе, за выключэньнем хіба асобных музычных праектаў, з розных прычынаў пацярпелі паразу. Аналізу амбітных плянаў, якія моцна працьверазіў бы гарачыя галовы, мы таксама пакуль не дачакаліся. Хіба што малады драматург атрымаў у прэсе «разбор палётаў» — і тое не без дапамогі маскоўскіх выданьняў, якія мо нічога ня ведаюць пра дачыненьні аўтара з «чэснымі» і «нячэснымі», але зьвяртаюць пільную ўвагу на тое, што адбываецца зь ягонай ласкі на сцэне.

Выклікае асаблівае недаўменьне, чаму крытыка і публіцыстыка, маючы такія цікавыя аб'екты, як Шамякін, Лучанок і Карызна, Гілевіч, Барадулін і Быкаў, не імкнецца аналізаваць уплыў самавызначэньня адносна ўлады на творчасьць. Зьдзіўляе асьцярожнасьць, зь якой СМІ прыглядаюцца да гэтакіх праяў новай культурна-фінансавай сытуацыі, як згаданы вышэй вундэркінд Курэйчык, расейскамоўныя літаб'яднаньні і выданьні накшталт «Немиги литературной» (а багатае ж поле для асацыяцый, улічваючы змрочны характар вобразу; ва Ўкраіне варта было б стварыць брацкае выданьне «Чарнобыль літаратурны»).

> Рэжым нельга лічыць наскрозь варожым беларускай культуры. Ужо з гэтай прычыны поўны байкот ня можа быць аптымальнай лініяй. Абсалютнае слуганьне — таксама. Застаецца сьлізкі пошук кампрамісу.

Не выклікаюць сьвербу ў крытыкаў і горш абароненыя ад іхняга сарказму ініцыятывы незалежнага грамадзтва — часопісы тыпу «Правінцыі», «Дзеяслова» ці «Куфэрка Віленшчыны», разрэклямаваная, але непрааналізаваная як след сэрыя выданьняў Логвінава (а варта было б паставіць колькі кропак над «і» наконт ужываньня расейскага мату ў «мастацкіх» мэтах ды яшчэ пад эгідай Натальлі Арсеньневай). І ўжо зусім па-за разглядам застаецца пытаньне, чаму ж гістарычны фільм «Настасься Слуцкая», зроблены пад патранажам прэзыдэнта, у колькасьці памылак з посьпехам можа паспрачацца з гістарычнымі п'есамі Алеся Петрашкевіча, які час ад часу друкуе далёкае ад уладавых ласкаў «Наша слова».

Маўчаньне крытыкаў можна тлумачыць тым, якіх намаганьняў патрабуе прачытаньне твораў — што з прыўладнага, што зь незалежнага асяродзьдзя. Дзе ўжо там адолець супастаўленьне: гэта ж у разы больш працы. Згадваецца прафэсар пэрсыдзкае літаратуры, які шчыра прызнаваўся студэнтам, што не дачытаў нават да сярэдзіны адной з паэм Нізамі, бо надта ж яна нудная.

Спакушальна проста вызначаць якасьць твораў і выданьняў па палітычнай фізіяноміі творцы ці рэдактара. Вось толькі вынікі такое практыкі несуцяшальныя, а ўскосныя эфэкты (мо лепш сказаць «афэкты», маючы на ўвазе прапанову памяняць «ЛіМ» на туалетную паперу) дык зусім змрочныя. Але, як гэта ні сумна канстатаваць, «ЛіМ» заслугоўвае зьнеслаўленьня — перш за ўсё за ігнараваньне стагнацыйных працэсаў у беларускай літаратуры, за ўпартае нежаданьне заўважаць яе жанравую і тэматычную беднасьць, за малы адсотак адмоўных рэцэнзіяў, за панэгірычны ўхіл і ружовыя акуляры, якімі рэдакцыя дзесяцігодзьдзі глядзіць на літаратурнае жыцьцё. За тое, карацей кажучы, як газэта пісала і піша пра літаратуру, і толькі потым — за апартунізм у асьвятленьні грамадзкага жыцьця, бо ў гэтым прынамсі назіраліся пэўныя ваганьні.

Усё скіроўвае нас да высноў, якія наўрад ці выклічуць захапленьне зацікаўленых бакоў. Палітычны рэжым, што б пра яго ні казалі, нельга лічыць наскрозь варожым беларускай культуры. Ужо з гэтай прычыны татальнае супрацьстаяньне яму, поўны байкот ня могуць быць аптымальнай лініяй. Слуганьне паводле прынцыпу «толькі загадай» — таксама. Застаецца сьлізкі і няўдзячны пошук кампрамісу.

Для любой творчай ініцыятывы найлепш узьняцца над гэтым падзелам, асягнуць гэткі ўзровень, каб твор нельга было ігнараваць ніводнаму з бакоў. («Выдатная парада, — казаў адзін з герояў «Піквіцкага клюбу», — каб яшчэ ведаць, як ёй пакарыстацца!») Для таго каб не надышла ноч, важней ня тое, ці чытаем мы «День», а тое, што ў гэтым «Дні» пішуць. Бо нехта прачытае і раскажа іншым — было б прачытанае таго варта. На сёньня ж ня столькі зьмест твораў складае твар пэрыядычнага выданьня, колькі выданьне праз дэклярацыю сваіх намераў стварае палітызаваную, як гэта ні сумна, аўру вакол даволі-такі аморфнага твору.

Як кажа легенда, выдатная паэма Фірдоўсі «Шах-намэ» спачатку не прыйшлася даспадобы «спонсару», і ён пазбавіў паэта ганарару, але потым прыслухаўся да грамадзкай думкі і выправіў памылку. Хіба няма тут паралеляў зь лёсам твораў Васіля Быкава, Уладзімера Караткевіча? Нават творчасьць Уладзімера Арлова выдаецца што дзяржаўнымі, што незалежнымі выдавецтвамі. І не прыходзіць у галаву казаць пра калябарацыю ці здраду ідэалам.

Найвялікшая цяжкасьць, такім чынам, у фармаваньні адпаведнага, можна сказаць, мэсіянскага настрою. Прасьцей кажучы, спрыяльнага, цікаўнага, але поруч з гэтым патрабавальнага стаўленьня да культуры. Калі «мэсія» варты будзе свайго высокага імя, ён пераканаўча вызначыць межы для калябарацыі і супраціву. У гэтым будзе ягоная свабода творчасьці. Яна можа быць завяваная кім хочаце — але толькі творчасьцю.

Бо калі па шчырасьці, дык улада аднолькава эфэктыўна абмяжоўвае што «калябарацыяністаў», што «інсургентаў». Першых — у свабодзе выказваца, другіх — у магчымасьцях быць пачутымі. Змагацца за права голасу даводзіцца і адным і другім, і зброя тут адна — творчае майстэрства. Калі ж нешта сапраўды ўдаецца, калі можна казаць не пра майстэрства, а пра талент, то дапраўды малаістотна, у якім з хаўрусаў гэта нарадзілася. Бо талент мае здольнасьць казаць праўду насуперак уласным перакананьням.

# Таварыш Бэндэр

энатэка

**Сэнс гэтай тэхналёгіі ў тым, што з высушанай вінаграднай макухі робіцца пры дапамозе адмысловай хімічнай апрацоўкі парашок, з чайнай лыжкі якога атрымліваецца бутэлька напою, што сваім смакам ідэнтычны натуральнаму віну. Але градусу ў ім няма, гэтаксама як і цукру. Таму туды ў пэўнай кансыстэнцыі дадаюцца сьпірт і цукар. Сабекошт такога сурагату фантастычна нізкі — 4 цэнты за літар. Называецца ён — віно арыгінальнае.**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Беларускі рынак віна і вінных напояў адрозьніваецца ад рынкаў аналягічнай прадукцыі ў іншых краінах у першую чаргу празьмерным разьвіцьцём індустрыі пладовых моцных напояў, сумна вядомых пад назвамі «пладова-выгаднага віна», «чарніла», «чарла», «чарліка», «бырла» і г.д. Тады як пераважная большасьць ужываных вінаградных вінаў паступае з Малдовы альбо выпрабляецца беларускімі прадпрыемствамі з малдаўскай сыравіны. Аднак якасьць большасьці з гэтых напояў можна паставіць пад сумнеў: хоць атруціцца і немагчыма, але паводле міжнародных (у тым ліку і тых, якія дзейнічаюць унутры Малдовы) стандартаў іх можна назваць кантрафактнымі.

Трэба падкрэсьліць, што гэтая прадукцыя трапляе ў Беларусь цалкам легальна. Аб’ёмы імпарту можна ўявіць, калі даведацца, што на Беларусь прыпадае больш за 7% малдаўскага вінаробнага экспарту.

Законы аб вінаградных вінах у Беларусі практычна адсутнічаюць. Ніякіх нарматываў няма, таму, нягледзячы на тое што кожнаму спэцыялісту ў гэтай галіне вядома, што такое вінаграднае віно, паводле заканадаўства віном можна назваць любы напой, які ўтрымлівае пэўны градус і вінаградную альбо пладовую аснову. А экспэртыза далёка не заўсёды можа вызначыць, што знаходзіцца ў бутэльцы — віно ці штучны сурагат, выраблены з хімікатаў.

Існыя дзяржаўныя стандарты фактычна ня робяць розьніцы паміж натуральным вінаградным віном і штучным, называючы апошняе «арыгінальным». Варта нагадаць, што гэткага «ганаровага тытулу» звычайна ўдастойваюцца родныя «водары мяты» і «таварышы бэндэры» (такое літаратурнае «чарніла» цiснулі на Ілаўскім вінзаводзе). Але на бутэльцы гэта не напісана, тым больш што некаторая прадукцыя пазбаўленая налепак на беларускай ці расейскай мовах. Не напісана гэта і на заводзкай этыкетцы на румынскай мове.

Увогуле, праз тое, што на некаторых бутэльках няма надпісаў на дзяржаўных мовах Беларусі, нярэдка ўзьнікаюць розныя казусы. Напрыклад, на этыкетцы з малдаўскім віном «Бакара» толькі назва напісана кірыліцай. Унізе — дробнымі літарамі тэкст па-румынску: «Vin de mere». Яблычнае віно, значыць, — а побач на палічках стаяць яго беларускія «сябры» па два рублі за «фаўст». У самой Малдове, дарэчы, такога віна ня п’юць нават апошнія булдосы. Тутэйшыя вытворцы за мову схавацца ня могуць. Вось і прадавалася колькі гадоў таму ў менскіх крамах «Віно вінаграднае», выраблена з «найлепшых сартоў яблык Рэспублікі Беларусі».

Цяпер ужо цяжка даведацца, хто вынайшаў «чарніла». Паводле некаторых краніцаў, гэты сурагат першымі вырабілі французы. Але ў Малдове карыстаюцца турэцкім рэцэптам. Першапачаткова менавіта з Турэччыны ў «вінаградную рэспубліку» паступала сыравіна для «арыгінальнага віна». Сэнс гэтай тэхналёгіі ў тым, што з высушанай вінаграднай макухі робіцца пры дапамозе адмысловай хімічнай апрацоўкі парашок, з чайнай лыжкі якога атрымліваецца бутэлька напою, што сваім смакам ідэнтычны натуральнаму віну. Але градусу ў ім няма, гэтаксама як і цукру. Таму туды ў пэўнай кансыстэнцыі дадаюцца сьпірт і цукар. Сабекошт такога сурагату фантастычна нізкі — 4 цэнты за літар.

Для параўнаньня можна прывесьці тэхналёгію вытворчасьці сапраўднага вінаграднага віна. Закупачны кошт кіляграма вінаграду, прыдатнага для вінаробнай прамысловасьці, у малдаўскіх вёсках складае, у залежнасьці ад гатунку сыравіны, каля 24 цэнтаў. Выхад віна з кіляграма сыравіны — ад 0,5 да 0,8 літра. Пры такіх лічбах сабекошт бутэлькі ардынарнага віна ня можа быць меншы за 1,5—1,8 даляра за бутэльку. Гэта ўжо ня кажучы пра марачныя віны. У Малдове нават свойскае маладое віно гаспадыні ў вёсках не прадаюць таньней за 2 даляры за 1,5-літровы «балён». А сярод малдаўскіх вінаў, разьлітых у Беларусі, трапляюцца экзэмпляры, якія нават у дарагіх крамах каштуюць па 3 тыс. рублёў. Калі б сапраўды яны былі зроблены з натуральнай сыравіны, для прадпрыемства такі бізнэс быў бы стратным.

> Паводле заканадаўства віном можна назваць любы напой, які ўтрымлівае пэўны градус і вінаградную альбо пладовую аснову.

Нельга сказаць, што гэткая сытуацыя не хвалюе малдаўскі бок. Яшчэ ўрад Думітру Брагіша ў свой час зацьвердзіў закон, які забараняў каталіз працэсу браджэньня віна пры дапамозе цукру, вады, сьпірту або іншых рэчываў. Але гэта не датычыць экспартнай прадукцыі, у тым ліку і спажыванай у Беларусі.

Трэба выказаць падзяку айчыннаму прадпрыемству «Амбасадор». Яны хаця б пішуць на бутэльках шчыра: «Віно арыгінальнае». 100% прадукцыі «Амбасадору» — гэта менавіта арыгінальныя віны, і натуральных вінаў яны не вырабляюць. Куды складанейшая сытуацыя зь вінамі, выпрабленымі ў Малдове, якія трапляюць на беларускі рынак. Вельмі рэдка на іх этыкетках можна сустрэць надпіс «віно арыгінальнае». Тут ужо ўсё залежыць ад таго, дзе купляць віны і якіх гандлёвых марак. Найпрасьцей для менчукоў набыць нармальнае якаснае віно ў буйных фірмовых крамах, такіх, як «Парк», «Цэнтральны» і г.д. Таксама «родныя» малдаўскія віны прадаюцца ў спэцыялізаванай краме ўнутры крытага Камароўскага рынку. Пакуль шчэ ня здрадзілі якасьці сваёй прадукцыі гандлёвыя маркі «Пуркар» (гатункі «Negru de Purcari», «Roşu de Purcari», «Purpuriu de Purcari»), «Крыкава — Акарэкс» (вытворца ў тым ліку вядомых гатункаў шампанскіх вінаў, вытрыманых у штольнях былых каменяломняў). Небясьпечна купляць віны, выраблены ў рэспубліцы Гагауз-Еры («Камрацкае», напрыклад), часткова — у Прыднястроўі (акрамя, бадай, славутага вэрмуту «Букет Малдавіі»).

Асноўная прычына такой сытуацыі — нізкія акцызныя стаўкі на арыгінальныя вінаградныя віны. Квоты на вытворчасьць арыгінальных вінаградных вінаў пастаянна павышаюцца, на натуральныя ж віны беларускі ўрад быццам бы забыўся. У гэтым адлюстроўваецца палітыка ўладаў: кожнаму — чарку і шкварку.

**Раман Мамчыц**

# Чым пахне «сэканд-хэнд»?

Першыя менскія «сэканд-хэнды» былі «кватэрнымі», для сваіх, затым продаж ужываных рэчаў перамясьціўся на буйныя сталічныя рынкі. Цяпер у кожным раёне — па некалькі дзясяткаў крамаў «эканам-клясы», дзе ёсьць і «барахолкі», і сапраўдныя бутыкі.

У адным з самых новых менскіх «сэканд-хэндаў», што ў Малінаўцы, уразіў найперш спэцыфічны пах нямытага адзеньня (гэта абудзіла ўспаміны пра кватэрныя распродажы «тавараў з Эўропы» ў 90-я. Двухпакаёўкі былі застаўлены торбамі са сьмярдзючым адзеньнем і абуткам, так што амаль не заставалася месца гаспадарам). Паводле слоў прадавачак з крамы, найбольшым попытам карыстаюцца жаночыя жакеты і саколкі. Хаця большасьць рэчаў даўно выйшлі з моды, попыт ёсьць. Ужо праз 15 хвілін пасьля адкрыцьця ў гандлёвай залі, якая месьціцца ў памяшканьні былога дзіцячага садка, было з два дзясяткі пакупніц. Пытаюся ў самае маладое і густоўна апранутае, што яна для сябе набыла. Аказваецца, прыйшла па дзіцячыя апранахі і што-небудзь для бацькоў у вёску. «Для бацькі знайшла прыстойны пінжак, а маці — колькі футболак». Маўляў, што тым старым трэба… Тавар тут прадаецца на вагу: 18 тысяч рублёў за кіляграм. Нярэдка набываюцца пакункі, большыя за кіляграм. Дарэчы, кілё баваўняных рэчаў роўна 5—6 саколкам. Адна новая каштавала б на рынку ад 10 тысяч. Такія «сэканд-хэнды» найчасьцей месьцяцца ў пад’ездах ці падвалах. «Іх колькасьць у краіне цяжка назваць», — кажуць у Міністэрстве гандлю.

Найбуйнейшая зь менскіх крамаў «сэканд-хэнд» — у Кунцаўшчыне. Як кажуць надпісы на яе вітрынах, там я мушу знайсьці рэчы ад «Hugo Boss», «Levis», «Nike» ды іншых вядомых брэндаў. Адшукаў толькі зь дзясятак добра ўжываных джынсаў ад Леві Страўса з падранымі калашынамі. Большасьць рэчаў маюць хіба нашыўку «Made in…». Зазірнуў у службовае памяшканьне, куды ўваход забаронены. Там сотні баулаў з пінжакамі, нагавіцамі ды іншым дабром. Што добра выглядае — трапляе ў гандлёвую залю, што горш — на супэрраспродаж. Цана кіляграма тут — 14500 рублёў. Найбольшым попытам карыстаюцца ў гэтай краме мужчынскія футболкі, шкарпэткі, якія набіраюць поўнымі кошыкамі.

Зусім іншы «сэканд» знойдзены на Партызанскім праспэкце. У ім рэчы прадаюцца ўжо паасобку. На выхадзе пытаю дзяўчыну, што яна набыла. Паказвае джынсавы джут за 12 тысяч. Куртка аказалася нават фірмовай. Як ёй патлумачылі прадавачкі, за мяжой джута не набылі на працягу аднаго сэзону, таму яго і перадалі ў гуманітарную дапамогу. Адтуль ён трапіў у «сэканд-хэнд». Пэўна, такія крамы і былі заканадаўцамі моды на адзеньне сярод студэнтаў у 90-я гады. Праўда, і тады адзеньне з сэкандаў абіралі толькі самыя прасунутыя. Вадзім насіў вельмі дзіўныя на той час вэльвэтавыя нагавіцы ў абцяжку і нейкую шалёнага колеру байку. Цяпер такое не выглядае нават арыгінальным. «Мода на «сэканд»-адзеньне — ня дзіва, бо пасьля развалу саюзу яшчэ была прага паказаць сябе незвычайным. Цяпер усё зьвялося да Жданоў і «Дынама». Асартымэнт першых сэкандаў меў ухіл у 80-я», — кажа Вадзім.

Сёньняшні «сэканд-хэнд» стаў таннай копіяй рэчавага рынку. Аднак і ў ім знаходзяць файныя аксы і адзеньне. Ня так даўно ў клюбе «NC» прайшоў паказ моды «сэканд-хэнд». А яшчэ па клюбах тусуецца Лазар — хлапец, што з адзеньня «эканам-клясы» пры дапамозе фарбы стварае фічы па 30—40 у.а. «Сэканд-хэнд» жывы!

**Сяргей Трафілаў**

ARCHE
твой любімы часопіс
падпісны індэкс 00345

Цяпер у новым аблiччы і праз падпіску

# Песьняры ў Мазыры

## Мінулі часы, калі літаратары ехалі ў Менск з правінцыі

«Просто имя мое — Масло Масленое», — піша Дзьмітры Дзьмітрыеў з праспэкту Дзімітрава ў Магілёве. Гэта адзіны расейскамоўны пераможца ПЭНаўскага літаратурнага конкурсу імя Натальлі Арсеньневай. Дзіма ўжо мае кнігу, якая выйшла ў Расеі тыражом 500 асобнікаў. Ён памятае, як пачаў складаць вершы: проста прыйшоў дахаты з школы і падумаў: «Як гэта людзі складаюць вершы? Можа, і мне паспрабаваць?» Так «па-калдырску» ўсё і пачалося, а цяпер кожны верш выношваецца па некалькі месяцаў, падчас асноўнай працы гукаапэратарам на тэлевізіі. Студэнткі Мазырскага дзяржаўнага пэдагагічнага ўнівэрсытэту выстройваліся ў чаргу, каб атрымаць аўтограф яго і яшчэ трох удзельнікаў конкурсу, якія даехалі да Мазыра, — Каці Марголь, Глеба Лабадзенкі і Сяргея Прылуцкага.

Да Мазыра пераможцы конкурсу дабраліся пасьля выступаў у Гомельскім і Гарадзенскім унівэрсытэтах, таму страху перад публікай ужо ня мелі. У цягніку лічылі ахвяр холаду і жартавалі, што ад праекту «12+1» хутка застанецца толькі «6+1».

Мазырскі пэд (асобныя факультэты) займае былую вайсковую ракетную часьць. У горадзе ажно два помнікі Пушкіну, а ўнівэрсытэт носіць імя Крупскай, з чаго пацешыліся аўтар перапісьці Івана Жахлівага з Надзеяй Канстанцінаўнай і куратар праекту Андрэй Хадановіч, а таксама ляўрэатка Каця Марголь, у новым творы якой Крупская фігуруе як галоўная гераіня.

Студэнты імя Крупскай заклапочаныя «добраахвотным» зборам «на Тураў» — чарговы праект кшталту Нацыянальнай бібліятэкі, даніну на якую зьбіраюць па вобласьці пасьля візыту туды кіраўніка дзяржавы. А студэнткі філфаку мараць пра нафтавіка — інакш ім наканавана настаўніцтва ў чарнобыльскай зоне. Катэдра беларускай літаратуры мае шыкоўны від на Прыпяць. Незразумела, як можна вучыцца з такім краявідам за акном. Гасьцінныя гаспадыні Тамара Нуждзіна і Натальля Кушар клапаціліся пра гасьцей, забыўшыся на дзяржаўныя іспыты. Сталоўка ў Мазыры пакуль найлепшая ў рэйтынгу студэнцкіх сталовак, які вядзе Ганна Кісьліцына. Жывучы ў «міні-Кіеве», трэба мець неблагія цягліцы на нагах: горад разьмешчаны на ўзгорках і ўвесь час даводзіцца спускацца-падымацца па лесьвіцах.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ
Паэтка Кацярына Марголь

Імпрэза ў Мазыры паказала, што мінулі часы, калі літаратары ехалі ў Менск з правінцыі. Цяпер літаратары едуць у правінцыю выступаць. І як бы ні радаваліся слухачы пагер-вершам Глеба Лабадзенкі, пэйджэр у вочы бачылі, напэўна, рэдкія зь іх. А калі б Глеб усё ж перайшоў на мабіл-вершы, гэта канчаткова стварыла б прорву паміж ім і мазырскай аўдыторыяй, дзе адзіныя мабілкі былі ў гасьцей.

Пра ляўрэатаў гадзінамі можа распавядаць Ганна Кісьліцына, а раней яны былі для яе толькі парадкавымі нумарамі ў конкурсе. А я побач з маладымі літаратарамі адчула сябе іншым біялягічным відам: чаму я не пішу вершаў? Гэта ж так натуральна!

**Вераніка Дзядок**

### «Літара» для кампутара

ТБМ прэзэнтавала праграму кампутарнай праверкі артаграфіі ў беларускамоўных тэкстах «Літара 1.0». Праграма распрацавана пад тэкставы рэдактар «Word», працуе з тэкстамі ў афіцыйным і клясычным правапісах, а таксама канвэртуе тэксты з аднаго правапісу ў другі. Тэхнічным бокам распрацоўкі займаўся Хведар Піскуноў, моўным — Генадзь Цыхун, Сяргей Шупа ды іншыя вядомыя мовазнаўцы. Распаўсюджваецца праграма бясплатна, адзіная ўмова — абавязковая рэгістрацыя карыстальніка. У Інтэрнэце яе можна спампаваць з сайту www. pravapis.tut.by, а на сядзібе ТБМ (Менск, вул.Румянцава, 13) дыск з праграмай мяняюць на два чыстыя CD-R. Праўда, пакуль шмат нараканьняў выклікае тэхнічны бок працы праграмы.

### Гілевіч у 23 тамах

Прэзэнтаваны першы том збору твораў Ніла Гілевіча. У кнігу ўвайшлі 83 вершы 1946—1990 г. У наступныя тамы ўвойдуць вершы, паэмы, пераклады (у тым ліку раней ананімныя «Сказ пра Лысую гару», «Ачмурэньне», «Гэй, наперад!», «Сказ пра ватнік», «Сказ аб незвычайнай эпідэміі ў старажытнай Тутэміі», «Сказ пра Лігу Чыстакроўных»), публіцыстыка, эсэістыка, лекцыі па гісторыі літаратуры й фальклярыстыцы, частка дзёньнікаў. Займаецца выданьнем таварыства «Кніга».

### 10 дабітых мурынчыкаў

«10 мурынчыкаў» Агаты Крысьці адгэтуль маюць выходзіць толькі пад назовам «І не было ўжо нікога» («And Then There Was None»). Такое рашэньне прыняў праваўладальнік — унук пісьменьніцы. Упершыню пад гэтай назвай кніга выйшла ў амэрыканскім выданьні ў 1940 г. (праз год пасьля выхаду ў Брытаніі). У 1943 г. у Лёндане выйшаў спэктакль пад першапачатковым найменьнем, але ў нью-ёрскай прэм'еры ў 1944 г. гледачы бачылі «10 індзейчыкаў». Пратэсты індзейскай меншыні прывялі ў 1997 г. да паліткарэктнай зьмены назвы — «І не было ўжо нікога».

### Індыйскі комікс

Першы індыйскі комікс «Калідор» Сарната Бэнэрджы адразу стаў бэстсэлерам. Гэта першае выданьне асобнай кнігай — дагэтуль коміксы друкаваліся толькі невялікімі гісторыямі ў газэтах. У «Калідоры» распавядаецца пра мумбайскага антыкквара, які калекцыянуе цікавосткі накшталт яек, якія любіў есьці Карл Маркс. Урэшце на яго зыходзіць прасьвятленьне…

Адзіны беларускі комікс, які выйшаў асобнай кнігай у сярэдзіне 90-х («Дзікае паляваньне караля Стаха» паводле аповесьці Ул.Караткевіча), таксама разышоўся імгненна.

### Памерла акторка фюрэра

У Аўстрыі ў 90 гадоў памерла вугорка Марыка Рэк (сапр. Марыя Кёрэр) — улюбёная акторка Гітлера, жаночы эталён арыйскай прыгажосьці. Найвядомейшая стужка зь ейным удзелам — «Жанчына маіх крозаў» (у савецкім пракаце — «Дзяўчына маёй мары»). У фільме Міхаіла Рома «Звычайны фашызм» М.Рэк называлі «коткай сэксу» і «галоўнай зоркай гітлераўскага кіно». У 70-х яна напісала кнігу мэмуараў «Сэрца зь перцам».

### Кніга Быкава

Міжнародны літфонд (Масква) разам з Саюзам беларускіх пісьменьнікаў падрыхтаваў зборнік прозы Васіля Быкава «Парадоксы жыцця». У зборнік увайшлі публікацыі апошніх гадоў, у тым ліку «Аўганец». Кніга павінна выйсьці да юбілею пісьменьніка накладам 2000 ас., яна ўключае беларускія тэксты і расейскія пераклады.

**АВ; БелаПАН**

# Іх музыку крадуць

Працяг са старонкі 2.

«Мы ведаем, пра што сьпяваем», — не бяз гонару кажуць удзельніцы гурту. Каб рэканструяваць фальклёр, трэба грунтоўная тэарэтычная падрыхтоўка. Напрыклад, асьпірантура Інстытуту мастацтвазнаўства этнаграфіі й фальклёру, якая ў большыні спадарынь з «Гуды» ўжо за плячыма. Гэтым гурт і розьніцца ад безьлічы іншых фольк-калектываў. Каб правільна сьпяваць абрадавыя песьні («Гуда працуе пераважна зь імі), неабходна цалкам разумець, штодачываў выканаўца, што пазначае кожны элемэнт, зварот. Яшчэ адзін прафэсійны прынцып — ніколі не сьпяваць «калядных песень у жніво, а жніўных — на Каляды», бо так ня будзе рабіць ніводная бабулька, нават калі фальклярыст-зьбіральнік вельмі папросіць.

Рэканструяваны «Гудай» песьні паўстаюць у максымальна чыстым выглядзе. Выканальніцкі эгаізм, і адпаведна «папсовасьць», зьведзеныя да мінімуму. Ніякага шоў, ніякага бізнэсу. Ці можа прадавацца такі прадукт? Відаць, можа, калі на яго спакушаюцца аўдыёпіраты. Песьні «Гуды», не спытаўшы дазволу, вывесілі на сваім інтэрнэт-сайце расейскія паганцы. У анатацыі дыск характарызуецца як «славянские песнопения», а слова «беларускі» адсутнічае наагул.

Другі прыклад «прадавальнасьці» непапсовай аўтэнтыкі — ірляндзкая музыка. Згадка пра дыхтоўна выдадзеныя сьпевы й найгрышы Зялёнае выспы выклікаў скрушны ўздых ва ўдзельніц «Гуды». «Ірляндцы так пісьменна, добротна паднесьлі этнічны матэрыял! Сьвет слухае й дзівіцца — нібыта няма нічога лепшага. А тут жа ўся справа ў падачы: каб нашыя сьпевы, нашу міталёгію так падаць, было б яшчэ й лепей!»

Бо ў тэлевізійных «вячорках», якія з БТ цяпер перацяклі на «Лад», дратуе менавіта вульгарызацыя, дух інсцэніроўкі, у якую ня вераць нават самі выканаўцы. «Сапраўдныя ж вячоркі рабіліся для сябе, не для паказу. Гэта ня толькі праца і сьпевы, гэта як сьвецкі раўт: дзяўчына пачала хадзіць на вячоркі — «выйшла ў сьвет», — тлумачыць Тацяна Яцкевіч.

Прафанацыйныя тэлевячоркі сталі магчымыя дзеля перарываньня традыцыі, выніштэньня народнае культуры зь сьвядомасьці беларусаў. Прычым адназначна вінаваціць у гэтым савецкую ўладу нельга. З аднаго боку, ідэалягізацыя загнала традыцыйную культуру ў падпольле, а русіфікацыя пасьля — у лапці. А зь іншага боку, калгасы, як тая дзікая першабытная грамада, спрыялі кансэрвацыі традыцыяў. Бо літоўскія й латыскія дасьледчыкі гавораць, што іх фальклёр задушылі не бальшавікі з калгасамі. Ён зьнікае пад ціскам татальнай інтэграцыі сьвету. Глябалізацыя, далучэньне да культурных кштaлтаў, якія былі раней забароненыя, а пасьля раптам адкрыліся, выклікалі разбурэньне традыцыйнай культуры, працягвае Вікторыя Міхно. У выніку фальклёр калі й застаецца, дык у нядаўніх глухіх ускраінах Эўропы. Як у той Ірляндыі.

Пад традыцыйнае пытаньне «А чаму вы называецеся «Гуда»? Ці не ад літоўскага «гудас» — беларус?» на катэдру тэорыі й гісторыі культуры, дзе гурт рэпэтуе, завітаў прафэсар Аляксей Рагуля. І кампэтэнтна адказаў: «Скарына тлумачыць, што Псалтыр — гэта ёсьць гуда, гудзеньне, музыка, сьпеў. А прыбалты гавораць на беларуса «гудас» — бандыт. Бо славяне колісь прыйшлі й адцясьнілі балтаў». Менш крымінальнае тлумачэньне прапанавала Тацяна Яцкевіч: «Гуда — працяглы аб'ёмны гук, які ахопліваe, вабіць. Мы імкнемся да такой манеры сьпяваньня».

**Сяргей Мікулевіч**

**Гурт «Гуда» ўтвораны у 1996, калі быў запрошаны прадстаўнік Беларусь на міжнародным фальклёрным фэсьце «BALTICA», у якім бяруць удзел гурты аўтэнтычнага фальклёру з рэгіёну Паўночнае Эўропы й Балтыйскага мора. Усе песьні выконваюцца акапэльна. У складзе гурта 7 чалавек. Усе ўдзельніцы гурта навучаліся сьпевам традыцыйным спосабам — з голасу.**

Канцэрт «Гуды» адбудзецца **25 траўня**, у аўторак, у Моладзевым тэатры эстрады (вул.Маскоўская, 18а, ст.м.Інстытут Культуры). Пачатак а 19-й. Даведкі па т.: 222-82-96, 8-029-616-84-90.

# Гнілушка

«Лысая сьпявачка» паводле Эжэна Янэска. Пастаноўка студэнтаў БДУІР.

«Гэта ня п'еса, а нейкая гнілушка!» — абураўся мой сябар пасьля паказу «Лысае сьпявачкі» Эжэна Янэска, зьдзейсьненага намаганьнямі студэнтаў БДУІР. Ён проста чытаў у дзяцінстве казкі братоў Грым, а ня драмы абсурду, як ты. Але ў чымсьці меў рацыю. Пераклад, як вядома, — вырадак літаратурнае дзейнасьці (чамусьці замест ладнага дзіцяткі Зьмітра Коласа абралі нейкае расейскае байстручаня).

Усьцешылі хіба рэжысэрскія знаходкі: паўза — дзеўка ў чырвоным, што выкручваецца пад фанэрныя енкі, гадзіньнік — тварына з талеркамі, якая матляецца на працягу ўсяго вар'яцтва, сымбалічнасьць дзеяньняў — пані Марцін круціць халахоп (замкнёная ў коле), пан Марцін вылупляецца на сьвет праз падводныя акуляры. Эратычны шрубалёт, захоплены каўбасойтэрарысткай… А яшчэ — атмасфэра, што вымусіла ўсіх пагрузнуць у самааналізе ды гуляць у постмадэрністаў пасьля дзеі.

А да гнілушкі п'еса насамрэч падобная: асьвятляе ноч афіцыйнага мастацтва, але наскім словам ня грэе.

**Болачка**

# Вайцюшкевіч — народу Італіі


АРЦЁМ ЛЯВА

Тодар рыхтуе падарунак італьянцам. Сваім праектам «Бывайце здаровы. Bella ciao» ён хоча выказаць ім падзяку за тое, што 14 год прымалі ў сябе беларускіх дзетак, пацярпелых ад Чарнобылю. Да працы над праграмай беларуска-італьянскіх песьняў Зьміцер прыцягнуў Аляксандра Памідорава і бізнэсоўца Зьмітра Папова (менавіта ён калісьці падарыў на «Рок-каранацыі» гітару Вольскаму). Дарэчы, песьня Лявона «Б'янка, к'янці і марціні» таксама прагучыць у рамках гэтай праграмы. Усяго ў праект увойдзе 7 песень, сярод іх «Бывайце здаровы» і «Лістапад» з праграмы «Паравіны году» прагучаць на італьянскай мове. Дыск мае выйсьці 3 чэрвеня — у дзень незалежнасьці Італіі. Паралельна «WZ-orkiestra» рыхтуе праграму на вершы Адама Русака. Таксама пад назвай «Бывайце здаровы». Яе прэзэнтацыя адбудзецца **27 траўня** ў Доме вэтэранаў з удзелам Алега Хаменкі, Надзеі Мікуліч.

## «NRM»

«NRM» выступіць **22 траўня** зь першым у XXI ст. клюбным канцэртам групы ў сталіцы. Вечарына пачнецца а 19-й у клюбе «NC», што знаходзіцца на вул. Кастрычніцкая, 17 (ст.м. «Першамайская»). Квіток — 10000 руб.

**29 траўня** гурт заедзе ў Баранавічы. Канцэртам у гэтым горадзе мае скончыцца беларуска-расейска-польскае турнэ гурту. Канцэрт меўся адбыцца 15 траўня, але якраз у гэты дзень у горад заяжджаў Лукашэнка, таму, паводле Пітавага выказваньня, «усім перакрылі кісларод». Хоць, як кажа дырэктар групы Ўладзімер Шаблінскі, канцэрт 29-га таксама пакуль пад пытаньнем. Ну, а да 3 чэрвеня «NRM» рыхтуе адмысловую акустычную праграму. У гэты дзень гурт выступіць на прэзэнтацыі новай кнігі Адама Глёбуса ў актавай залі Дому літаратара.

## Дзень народзінаў Кулінковіча

У той час як лідэр «Палацу» Алег Хаменка справіў свой дзень народзінаў у пампэзнай рэстарацыі «Журавінка», дзе «Палац» ня так даўно даваў свой канцэрт, Аляксандар Кулінковіч вырашыў адзначыць сваё ўласнае сьвята больш сьціпла. З нагоды ягонага дня нараджэньня «Нэйра Дзюбель» адыграе вялікі сольнік у клюбе «NC» **23 траўня**. Паводле слоў лідэра «НД», гэты канцэрт будзе звычайным: да прэзэнтацыі новага і першага ў гісторыі групы беларускамоўнага альбому «Танкі» музыкі толькі рыхтуюцца. «Нэйра Дзюбель» часьцяком дае канцэрты на невялічкай сцэне «NC». У вялікіх залах калектыў даўнавата не выступаў. Аляксандар тлумачыць гэтую акалічнасьць тым, што ў «Новым клюбе» ня трэба доўга рыхтавацца да выступу. «Прыйсьці ды адыграць без усялякіх замарочак нам лягчэй», — зазначае лідэр «НД». Акрамя «Нэйра Дзюбелю» ў канцэрце возьмуць удзел музыканты «Нагуаля» і «Віруса ліха». Яны рыхтуюць супольную панк-праграму. Нечаканы праект, калі ўлічыць, што першыя граюць псыхадэлічны фольк, а другія заангажаваныя ў рэгі-ска. Пачатак вечарыны а 18-й.

## Барды пад Горадняй

**22—23 траўня** адбудзецца фэстываль аўтарскай песьні «Зялёнка». Месца: прадмесьце Горадні, на лясной прагаліне на правым беразе Нёману за дзіцячай турбазай у раёне «Крэйдавыя горы».

## Глядыятарскія баі

**22 траўня** ў клюбе «Акварыюм» — «Ozzy Osbourne Parade». Пачатак а 15-й. Арганізатары абяцаюць глядыятарскія баі, конкурсы, а таксама выступы паэтаў Зьмітра Пляна і Віктара Жыбуля & Джэці.

## «Гарацкія», «Pete Paff»

Піт пакажа аж два свае праекты. **27 траўня** ў клюбе «NC» адбудзецца сольны канцэрт «Гарацкіх». Слухачоў чакаюць дзьве гадзіны жывой музыкі. Спэцыяльныя госьці — «Сьцяна», уладальніца другога месца на фэсьце «Генэралы айчыннага року». Пачнецца вечарына а 18-й. Квіток — 6000 руб. Фольк-праект Піта «Pete Paff» свой канцэрт будзе даваць **24 траўня** ў актавай залі філфаку БДУ. Піт хоча правесьці гэткі канцэрт-лекцыю з растлумачэньнем усім прысутным залікаў.

## Гліняны Вялес

Сёлетнім ляўрэатам прэміі «Гліняны Вялес» стаў Пятро Васючэнка за дзіцячую кнігу «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі». Уганараваньне адбудзецца **22 траўня** ў Полацкім музэі кнігадрукаваньня. Пачатак аб 11-й.


УЛАДЗІМЕР СКАМАРОШЧАНКА

## Выставы й канцэрты

### Каты і архідэі

**22—23 траўня** ў Менскім палацы дзяцей і моладзі адбудзецца Міжнародная выстава катоў. Можна будзе пабачыць больш за 300 парод гэтых жывёл з розных краін сьвету.

**23 траўня** а 13-й адбудзецца шоў-прэзэнтацыя пароды «ацыкет». Таксама можна будзе паглядзець выставу «Чароўны сьвет архідэяў», а ў 17.00 адбудзецца сьвяточнае шоў з удзелам найлепшых катоў выставы.

### Нафтагаз

**З 25 да 28 траўня** ў выставачным павільёне на Я.Купалы, 27 адбудзецца 9-я Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Хімія. Нафта і газ-2004».

### Акварыюм

**23 траўня** ў к/з «Мінск» у юбілейным туры «БГ-50» выступае гурт «Акварыюм». Квіткі ад 22000 да 60000.

### Мастацкі музэй

Да **31 траўня** можна паглядзець выставу народнага мастака Беларусі Ўладзімера Стальмашонка.

## Клюбы

### NC

**22** (сб), 19.00 — «NRM».

**23** (ндз), 18.00 — «Нэйра Дзюбэль» + панк-праект музыкаў гуртоў «Нагуаль» і «Вірус ліха».

### Bronx

**20** (чц), 22.00 — клюбны чацьвер. Dj Kulikov.

**21** (пт), 22.00 — live music: Тані Фарэда (вакал).

**22** (сб), 22.00 — dj Bergamo, dj Grizzly.

### Белая вежа

**20** (чц), 22.00 — «White tower». Dj Top, dj Grizzly.

### Graffiti Club

**27 траўня** «Graffiti Club» запрашае на канцэрт Анжэлы Худзік і Аляксандра Саліенкі. Даведкі праз тэл.: 758-40-54. Замова месцаў: 693-74-16, 280-01-54

### X-Ray

**21** (пт), 22.00 — dj Yulik, dj Орлов (італа-дыска)

**22** (сб), 22.00 — dj Топ.

### Ямайка

**21** (пт), 21.00 — pre/arter party. 21.00 — 24.00 — dj Paliony. 3.00 — XXX — dj Danny Boy (Kieў), dj Noche.

### Presto

**22** (сб), 23.00 — «Jetsounds Cosmic Corp.» presents dj Бергамо (house-o-holics).

## Тэатры

### Тэатар імя Янкі Купалы

**20** (чц) — «Парфён і Аляксандра».

**Сцэна ў Рэспубліканскім палацы культуры прафсаюзаў**

**21** (пт), **22** (сб) — «Смак яблыка».

**23** (ндз) — «Я не пакіну цябе…».

**26** (ср), **27** (чц) — «KIM».

**Малая сцэна**

**27** (чц) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».

### Опэра

**25** (аўт) — «Травіята».

**27** (чц) — «Тоска».

**29** (сб) — гала-канцэрт з удзелам салістаў, хору і аркестру тэатру.

### Балет

**23** (ндз), **30** (ндз) — «Лебядзінае возера».

**26** (ср) — «Дон Кіхот».

**28** (пт) — «Рамэо і Джульета».

### Драматычны тэатар «Дзе-я?»

**20** (чц) — «Шалёныя грошы».

**25** (аўт) — «Рамантыкі».

**26** (ср) — «Жанчыне не забароніш…».

**27** (чц) — «Ня бойся быць шчасьлівым».

### Музычны тэатар

**23** (ндз) — «Ноч у Вэнэцыі».

**25** (аўт) — «Дарагая Памэла».

**26** (ср) — «Цыганскі барон».

**27** (чц) — «Даратэя».

### Тэатар эстрады

**20** (чц), **26** (ср) — танцавальна-гумарыстычная праграма «Данс-гумар-шоў».

**27** (чц) — «Танцы ў чырвоным».

**28** (пт) — эстрадна-тэатралізаванае шоў «Эстрадны кактэйль».

### Моладзевы тэатар

**20** (чц) — «Позьняе каханьне».

**21** (пт) — «Вынаходлівая закаханая».

**22** (сб) — «Пігмаліён».

**23** (ндз), **28** (пт) — «Акадэмія сьмеху».

**27** (чц) — «Тойбэле і яе дэман».

### Заля камэрнай музыкі

**24** (пн) — канцэрт арганнай музыкі.

**25** (аўт) — вечар беларускай вакальнай музыкі.

**27** (чц) — канцэрт студэнтаў Акадэміі музыкі.

**28** (пт) — творчы вечар саліста Тэатру опэры Алега Гардынца.

## Рэпэртуар менскіх кінатэатраў з 21 да 23 траўня

**«Аўрора»** (253-33-60)

«Троя» (прэм'ера): **21** (пт) 14.00 (іл), 17.00, 20.00; **22, 23** (сб, ндз) 14.00 , 17.00, 20.00.

«50 першых пацалункаў»: **21** (пт) 16.30; **22, 23** (сб, ндз) 14.20, 16.30.

«Затаічы» («Кінафармат 4x4»): **21** (пт) 19.00, 21.00.

«Вясна, лета, восень, зіма… і зноў вясна» («Кінафармат 4x4»): **22** (сб) 19.00, 21.00.

«Акно насупраць» («Кінафармат 4x4»): **23** (ндз) 19.00, 21.00.

**«Бярэсьце»** (272-87-91)

«Нават ня думай-2: Цень незалежнасьці»: **21—23** (пт—ндз) 19.00.

«А вось і Полі»: **21** (пт) 17.00, 21.00; **22, 23** (сб, ндз) 13.10 (іл), 17.00, 21.00.

«Фанфан-цюльпан»: **21** (пт) 15.00.

«Мільён год да нашай эры»: **21** (пт) 15.00.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)

«Троя» (прэм'ера): **21, 22** (пт, сб) 14.40, 17.50, 21.00; **23** (ндз) 14.40 (іл), 17.50, 21.00.

**«Масква»** (223-27-10)

«Троя» (прэм'ера): **21** (пт) 18.00, 21.00; **22, 23** (сб, ндз) 12.00 (іл), 15.00, 18.00, 21.00.

**«Мір»** (284-37-71)

«Неслужбовае заданьне»: **21** (пт) 16.30; **22, 23** (сб, ндз) 14.30.

«Вясна, лета, восень, зіма… і зноў вясна» («Кінафармат 4x4»): **21** (пт) 18.40, 21.00.

«Горад Бога» («Кінафармат 4x4»): **22** (сб) 16.30, 18.40.

«Затаічы» («Кінафармат 4x4»): **23** (ндз) 16.30, 18.40, 21.00.

**«Перамога»** (223-77-66)

«Егер»: **21** (пт) 14.30.

«Акно насупраць» («Кінафармат 4x4»): **21** (пт) 16.30, 18.50, 21.10.

«Затаічы» («Кінафармат 4x4»): **22** (сб) 16.30 (іл), 18.50, 21.10.

«Горад Бога» («Кінафармат 4x4»): **23** (ндз) 16.30 (іл), 18.50, 21.10.

**«Піянер»** (227-64-87)

«Заплямленая рэпутацыя»***: **21—23** (пт—ндз) 19.00.

«Нешчасьліўцы»: **21—23** (пт—ндз) 15.40, 17.20, 21.00.

**«Цэнтральны»** (227-34-23)

«Барвовыя рэкі-2: Анёлы апакаліпсысу» ****: **21—23** (пт—ндз) 21.00

«Нават ня думай-2: Цень незалежнасьці» (прэм'ера): **21** (пт) 11.00, 13.00; **22, 23** (сб, ндз) 11.30, 14.30.

«Горад Бога» («Кінафармат 4x4»): **21** (пт) 15.30, 18.00.

«Акно насупраць» («Кінафармат 4x4»): **22** (сб) 16.00 (іл), 18.30.

«Вясна, лета, восень, зіма… і зноў вясна» («Кінафармат 4x4»): **23** (ндз) 16.00 (іл), 18.30.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)

Рэйтынгавыя абмежаваньні:

*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;

**** — дарослым з 18 год.

## Для дзетак

### Танец

**23 траўня** ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасьці дзяцей і моладзі (Фабрыцыюса, 5) клюб сучаснага танцу «Black fox» запрашае на канцэртную праграму «Сусьветная гісторыя». Т.: 226-79-22.

### Тэатар юнага гледача

**21** (пт), **29** (сб) — «Паліяна».

**22** (сб) — «Сястра мая Русалачка».

**23** (ндз), **27** (чц) — «Дзень нараджэньня ката Леапольда».

**26** (ср) — «Парася, якое сьпявае».

**28** (пт) — «Шлях на Бэтлеем».

**«Аўрора»**

«Кашэчыя лісты»: **21** (пт) 14.30; **22, 23** (сб, ндз) 12.00.

**«Бярэсьце»**

«Ліла і Стыч»: **22, 23** (сб, ндз) 11.30.

**«Мір»**

«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **22, 23** (сб, ндз) 12.30.

**«Перамога»**

«У пошуках Нэма»: **22, 23** (сб, ндз) 14.30.

**«Піянер»**

«Карпарацыя монстраў»: **21** (пт) 14.00; **22, 23** (сб, ндз) 10.30, 14.00.

«Атлянтыда: Згубленая імпэрыя»: **21** (пт) 12.00; **22, 23** (сб, ндз) 12.15.

**Паласу падрыхтавалі Наста Бакшанская, Сяргей Будкін, Васіль Кроква, Сяргей Петрыкевіч**

КІНО Ў МЕНСКУ

# Сьляпы вандроўнік супраць японскай мафіі ў кінафармаце «4x4»

«Затаічы» («Zatôichi»)
Японія, 2003, каляровы, 115 хв.
**Жанр:** Усходні баявік (кенгекі)
**Адзнака:** 7,5 (з 10)



Затаічы — сьляпы масажыст, гулец у косьці і непераўзыдзены майстар мяча — гэта пэрсанаж японскіх сэрыялаў 60-х гадоў. Другі майстар, актор і рэжысэр Такешы Кітана, асучасьніў гэтага амаль фальклёрнага героя (і нават перафарбаваў ягоныя японскія валасы ў белы колер).

Клан Гіндза тэрарызуе мясцовае насельніцтва. Становішча зусім пагаршаецца, калі якудза наймаюць на службу ваяўнічага самурая. Супрацьстаяць агрэсіўнай бандзе здольны толькі стары сьляпы (Кітана). Да Затаічы далучаюцца дзьве помсьлівыя гейшы (адна зь якіх насамрэч хлопчык) і недарэка-вясковец. Але гэтага дастаткова, каб кроў біла фантанамі, лязо расьсякала паветра — і маленькі ды быццам бы слабы чалавек перамагаў зло.

«Лічыцца, што гістарычнае кіно абмяжоўвае фантазію, — казаў Такешы Кітана, — але гэта зусім ня так». Кітана надзвычай трапна ўводзіць у фільм пра XIX ст. кампутарныя эфэкты — і сцэны боек выглядаюць вельмі відовішчна і арганічна.

Гледачам, якія будуць незадаволены колькасьцю забітых — а на той сьвет адпраўляюцца ў фільме ня болей за сто чалавек, — можна параіць зьвяртаць увагу на дождж, на дзіравы чырвоны парасон у кадры, на музыку — і самае галоўнае, на чаканьне. Калі быццам нямогласьць і сьлепасьць імгненна ператвараюцца ва ўзьнёслы й зграбны танец пакараньня.

Мы ведалі, што ўсходнія бойкі — гэта высокі балет. Але Кітана даводзіць, што гэта яшчэ і м'юзык-хол, і цёплая іронія.

**Андрэй Расінскі**

# Рамонкавы россып: працяг




Янка Брыль. Блакітны зьніч: Лірычнае. Менск: Про Хрысто, 2004.

Ужо 40 гадоў ведаючы Янку Брыля, не перастаю зьдзіўляцца зь ягонае маладое прагі да пазнаньня новых людзей, новых імёнаў і твораў. А яшчэ ягонае любоў да песьняў — «тых, што сапраўдныя»… І раптам такое прызнаньне: «…журботна, можа нават шчасьліва падумалася, адчулася: колькі цудоўных песень розных народаў не давялося, не давядзецца пачуць!..» Журботна? Гэта зразумела. Шчасьліва? Гэта, мусіць, радасьць за тое, што яны, тыя песьні, ёсьць, а калі яны ёсьць, значыць, ня ўсё так і блага з чалавецтвам і чалавекам. Маецца падстава для аптымізму.

І адразу пасьля гэтага запісу — запіс пра тых, хто музыцы, песьні служыў прафэсійна: Рыгор Шырма, Анатоль Багатыроў, Іосіф Жыновіч. Такая Брылёва манера: зь біяграфіі чалавека выхоплівае тое, што сьведчыць пра яго характар, душу як найлепш. Чытаеш і думаеш: а ўсё-такі не баяліся, ведалі цану сабе і чыноўнікам, над імі пастаўленым.

І працягваючы Брылёву думку: а колькі прыказак і прымавак не давялося і не давядзецца пачуць!.. Ня тых, што Міхась Клімковіч ды іншыя выдумлялі (іх пісьменьнік таксама цытуе), а народных. Цяпер, калі бачу й чую каго, хто абураецца пасьля чарговае дозы паклёпаў і хлусьні з экрану тэлевізара, супакойваю яго прыказкаю, вычытанаю ў новай кніжцы Янкі Брыля: сабака й на Бога брэша. Сапраўды, прыказка гэтая — «сродак народнай мэдыцыны».

А вось яглы, што ўвайшлі ў працытаваныя пісьменьнікам прыказкі, мне запомніліся чутым у нашым кутку: «На вячэру былі яглы: ня еўшы спаць ляглі». І намёкам на чыюсьці беднасьць: «У іх заўша на вячэру яглы» («ня еўшы спаць ляглі» маецца на ўвазе).

А стары, чуты Брылём ад бацькі мястачковы жарт, які можа ўвайсьці ў зборнікі фальклёру:

«Стары пытаецца ў сына падлетка:
— Што ты задумаўся, Зысалэ?
— Я думаю, татэ, куды ж гэта падзенуцца вераб'і, калі сынагога згарыць?..»

Захоўваючы і ў гэтай кніжцы прынцып «рамонкавага россыпу», пісьменьнік дзеліцца і ўражаньнямі аб прачытаным. Некалі, рэцэнзуючы для «НН» кнігазбораўскую кнігу Ігната Дамейкі, я пісаў, што той далёка стаяў ад свайго народу. І радасна было даведацца, што такое ж думкі і Янка Брыль. А яшчэ: «Чакаў, спадзяваўся, што ён [Дамейка] раскажа, як перапісваў «Пана Тадэвуша» [...] напіша, як ён дапамагаў вялікаму сябру, назіраў, перажываў яго натхненьне, а ён, замест таго, што ведае, бачыў, чуў адзін ва ўсім сьвеце, тлуміць мяне, чытача, эмігранцкай палітыкай, архітэктурнымі дзівосамі Парыжу, мітусьнёй ды марнасьцю сьвецкіх прыёмаў!..»

Чытаючы ўспаміны свайго партызанскага сябра Гірша Смоляра, пра якога ў кніжках Брыля ўжо нямала нататак, пісьменьнік робіць удакладненьні. Прыехаўшы на партызанскі парад у Менск, бывалец Смоляр і маладзейшы за яго Брыль ня ведалі, куды ім «ад голаду ткнуцца». І ўрэшце старэйшы завёў маладзейшага да тады чыноўнага Пііпа Пестрака. І яны елі… сала. Ежа некашэрная. Друкуючы ўспаміны ў Ізраілі, Г.Смоляр мусіў паважаць звычаі бальшыні, а таму й прыдумаў нейкі партызанскі кацёл, у які нібыта яны з Брылём «час ад часу запускалі свае лыжкі».

У кніжцы тры разьдзелы. Два зь іх — «Ці-шы-ня» ды «Ляцела зязюля…» — друкаваліся ў «Тэрмапілах» і «Дзеяслове». Цалкам новая, нечаканая рэч — эсэ «Нашы разлукі». Пра жонку — памочніцу, чытача і крытыка, маці дачок і сына. 66 гадоў сяброўства, амаль 58 гадоў у шлюбе — гэта шмат кажа і пра жонку, і пра мужа. Чытаючы гэтае эсэ, я наноў перажываю смутак. Але і ўсьміхаюся, і нават сьмяюся, калі чытаю лісты незабыўнае Ніны Міхайлаўны. Гэта яна. І шкадую, што мала зь ёю сустракаўся і размаўляў.

…Ледзь не забыўся на вельмі важнае. Кніжка выйшла ў бібліятэчцы часопісу «Наша вера». Беларускія рыма-каталікі, як і даўней, добра працуюць на ніве культуры.

**Анатоль Сідарэвіч**

# «Там» і «тут»




Месца выданьня — Парыж: Выбраныя старонкі часопісу «Моладзь» (1948—1954). Менск: Беларускі кнігазбор, 2004.

Агульнавядомы факт: францускія палітыкі і адміністратары, ад Жоржа Клемансо пачынаючы, у сваёй рутэна- і палёнафіліі шмат нашкодзілі нашаму народу і краіне. Ужо існавалі і БНР, і БССР, ужо БССР займала месца ў ААН, а францускія ўлады ў акупаванай Нямеччыне, потым і ў самой Францыі, па-ранейшаму не прызнавалі існаваньня нашага народу й зямшалі беларусаў пісацца расейцамі або палякамі. Ужо адно гэтае сьведчаньне мастака Міхася Наўмовіча ў прадмове да кнігі «Месца выданьня — Парыж» і ва ўспамінах, зьмешчаных у ёй, прымушае будучага дасьледчыка францускае палітыкі ў дачыненьні да беларусаў і Беларусі абавязкова ўлічваць зборнік, што нядаўна ўбачыў сьвет.

Гэта, так бы мовіць, міжнародны аспэкт кнігі, зь якое пачалася «Бібліятэка Бацькаўшчыны», заснаваная міжнародным грамадзкім аб'яднаньнем «Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына». Айчынны аспэкт выданьня значна шырэйшы.

Па-першае, кніга паказвае, што, нягледзячы на супрацьдзеяньне францускіх адміністратараў, беларусы патрапілі ня толькі адстаяць свае права звацца беларусамі, але й працаваць дзеля роднае культуры. І тут нельга не згадаць імён а.Лява Гарошкі, Міхася Наўмовіча, Янкі Філістовіча, Аўгена Кавалеўскага, Уладзімера Шыманца, ягоных дзяцей Івонкі Сурвіллы ды Лявона Шыманца…

Адной з праяў культурнае працы беларусаў зьяўляецца часопіс «Моладзь», што выходзіў у Парыжы, выбраныя матэрыялы якога Міхась Скобла ўклаў пад адною вокладкаю.

Адразу зраблю закід. На жаль, публіцыстычныя і гістарычныя тэксты, зьмешчаныя ў кнізе, не пракамэнтаваныя. А між тым для часопісу пісалі не адмысловцы, а маладыя людзі, якія дапускалі пэўныя недакладнасьці (што праўда, гэтыя маладыя людзі ведалі пра Беларусь нашмат больш, чым я ў сталейшыя гады). Ды, мусіць, у нас ужо мода такая пайшла: без камэнтароў выдадзены «лінгвістычны» двухтомнік і том гістарычных прац Яна Станкевіча, том Язэпа Лёсіка, да іх далучаецца «Месца выданьня — Парыж»…

Па-другое, кніга выбраных старонак «Моладзі» зьяўляецца як бы працягам справы, пачатае ў 1991 г. Тады, як мы памятаем, пачалося факсымільнае выданьне «Нашае долі» і «Нашае Нівы». Аднак факсымільнае выданьне — рэч надта працаёмкая. А тым часам ёсьць вострая неабходнасьць зрабіць даступнымі больш шырокаму колу дасьледчыкаў іншыя выданьні, у тым ліку заходнебеларускія і эміграцыйныя. Спадзяваўся, што гэта зробяць гулякі, не выпадае. І д-р Янка Запруднік падаў добры прыклад, надрукаваўшы ў кнізе «Дванаццатка» (Нью-Ёрк, 2002) матэрыялы часопісу «Наперад!», які выдавала беларуская моладзь у Ангельшчыне і Бэльгіі.

Вядома ж, у кнізе, укладзенай М.Скоблам, не паўтараецца структура нью-ёрскага выданьня, але ў асобныя разьдзелы вылучаны мастацкія творы (а ў падразьдзелы — проза й паэзія), публіцыстыка, тэксты на гістарычныя тэмы. На жаль, тут не пададзены, як у кнізе д-ра Запрудніка, зьмест усіх нумароў часопісу. І няма поўнае расшыфроўкі псэўданімаў і крыптанімаў яго аўтараў (М.Навумовіч у прадмове прызнаваўся, што «многае сьцерлася з памяці»).

Па-трэцяе, публікацыі «Моладзі» даюць мажлівасьць ужо сёньня многае ўдакладніць. Так, сам М.Скобла змог пераканацца, што пэўныя вершы Ларысы Геніюш былі ўпершыню надрукаваныя не ў кнігазбораўскім томе выбраных твораў паэткі, які ён укладаў (2000), а ў «Моладзі». Цяпер яму трэба было б высьветліць, як аўтографы гэтых вершаў трапілі да д-ра Запрудніка (мы памятаем, што іншыя вершы Л.Геніюш друкаваліся пад той час — у канцы 1940-х — і ў «Баявой ускалосі», і таксама ня маем адказу, як яны трапілі ў часопіс).

«Наперад!», «Моладзь»… А яшчэ ж былі «Сакавік» і «Шыпшына», «Беларуская думка» і «Баявая ўскалось»… Толькі ў 1945—50 г., як чытаем у гэтай кнізе (с.218—223), нашы эмігранты выдавалі 72 часопісы і бюлетэні. І многае, калі ня ўсё, з надрукаванага «там» чакае свайго перавыданьня «тут». Здаецца, справа зрушылася з месца. Каб толькі не сурочыць.

**АС**

# Мэры Энцін вяртаецца ў Полацак

15 траўня споўнілася 55 год з дня сьмерці вядомай амэрыканскай пісьменьніцы Мэры Энцін (Mary Antin), якая нарадзілася і жыла да трынаццаці гадоў у Полацку. У Амэрыку спачатку пераехаў бацька Марыі, а затым выклікаў у Бостан усю сям'ю — жонку, дзьвюх дачок і сына. У Марыі рана праявіліся здольнасьці да літаратуры — у 1896 г. газэта «Boston Herald» надрукавала першы верш яўрэйскай дзяўчыны-эмігранткі. Першая кніжка палачанкі выйшла ў 1899 г., называлася яна «З Полацку ў Бостан» — спачатку кніга была напісана па-габрэйску, а затым ужо перакладзена на ангельскую. У 1912-м Мэры Энцін выдае другую сваю кнігу «Зямля запаветная», шэдэўр амэрыканскай літаратуры, які вывучаецца ў школе. Кніга аўтабіяграфічная, у ёй пісьменьніца апісвае свае полацкае маленства, пераезд у Амэрыку і першыя гады жыцьця ў Бостане. Кніга праілюстравана фатаздымкамі: полацкія вуліцы, кірмаш, крамы, зімовая Дзьвіна, бабулін дом, заняткі ў хедэры і нават здымак полацкага далакопа.



Мэры Энцін

Мэры Энцін займалася ня толькі літаратурай, а й палітыкай як абаронца правоў эмігрантаў. Памерла пісьменьніца ў 1949 г.

На радзіме яна абсалютна невядомая. Часопіс «ARCHE» мае сёлета надрукаваць невялікі ўрывак з кнігі «Зямля запаветная», а сябры ТВЛ прывядуць у Полацку акцыі для ўшанаваньня памяці пісьменьніцы.

**Васіль Кроква, Полацак**



**На полацкай вуліцы ля хлебнай крамы. Здымак з кнігі «Зямля запаветная».**

## НОВЫЯ КНІГІ

**Другая сусьветная вайна: Новыя аспэкты дасьледаваньняў:** Матэр. Міжнар. навук. сэмінару, 1 вер. 2003 г., Менск./ Гістар. майстэрня ў Менску. — Менск, 2004. — 208 с. 100 ас.

Чым была Беларусь у 1941—1944 — эканамічным аб'ектам ці гаспадарчым суб'ектам? Якія старонкі гісторыі вайны й партызанкі дасюль застаюцца нявывучанымі? Што за лёс напаткаў у гады вайны беларускія музэі? Якую палітыку праводзілі германскія ўлады ў дачыненьні да мясцовых жанчынаў? Пад увагу аўтараў зборніку трапляюць гэтыя і іншыя аспэкты жыцьця Беларусі пад акупацыяй. Цана ў «Акадэмкнізе» 9600 руб.

**Гілевіч Н. Збор твораў:** У 23 т. Т. 1. Менск: ГА БТ «Кніга», 2003. — 416 с. 500 ас.

Новы збор твораў народнага паэта абяцае быць найбольш грунтоўным з усіх папярэдніх выданьняў. Але ў прадмове аўтар называе яго «Выбраным» і пералічае ўсё, што з розных прычынаў ня будзе ўключана ў 23 запланаваныя кнігі. Першы том сабраў вершы 1946—1990. У «Акадэмкнізе» каштуе 13780 руб.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# «Ён зрабіў з нас людзей»

## Памяці Трэнэра

### Бацька й Хрушчоў

Сяргей Хамчук нарадзіўся 1 чэрвеня 1935 году ў падмаскоўным Царыцыне. Маці была хатняй гаспадыняй. Ягонага бацьку, кавалера ордэна Працоўнага Чырвонага Сьцяга, ведаў шмат хто з крамлёўскіх тузоў, бо да вайны ён ачольваў буйную рыбную гаспадарку «Барысаўскія сажалкі» ў Маскве. Рыбу ў Хамчука заказвалі ад'ютанты Хрушчова, Мікаяна, Варашылава. Па вайне гаспадарніка разам зь сям'ёй перавялі ў Кіеў, дзе ён узначаліў Навукова-дасьледчы інстытут рыбнай гаспадаркі.

Хутка пасьля пераезду Андрэй Хамчук патрапіў у складанае становішча. У інстытуце вывелі новую пароду рыб, і Мікіта Хрушчоў, тагачасны першы сакратар ЦК КП Украіны, пажадаў асабіста ацаніць дасягненьні навукоўцаў. Некалькі разоў адборную рыбу прывозілі ў прызначаныя месца і час. Але Хрушчоў так ні разу і не зьявіўся. Заўсёднае тлумачэньне — «зьехаў па справах». Між тым каштоўная рыба падыхала.

Пасьля чарговай бескарыснай паездкі Хамчук абурыўся: «Больш не павязём — сам прыедзе!» Ультыматыўныя словы ў лічаныя гадзіны даляцелі куды трэба. Кіраўнік інстытуту атрымаў жорсткую вымову, і праца на былым месцы была для яго забаронена. Ведаючы аб праблемах Андрэя Хамчука, першы сакратар КПБ Мікалай Паталічаў запрасіў яго ў Беларусь на тую ж пасаду. Было гэта ў 1953 г. З тае пары сям'я Хамчукоў атабарылася ў Менску.

**Ужо год, як з намі няма патрыярха беларускай лёгкай атлетыкі Сяргея Хамчука. Яго справядліва называлі мэтрам тэхнікі і найлепшым дзіцячым трэнэрам краіны, бо ён вучыў сваіх выхаванцаў ня толькі выдатна бегаць і скакаць, але і філязофіі жыцьця. Яго галоўнай мэтай было ўзгадаваць сапраўднага чалавека — інтэлігентнага і разважлівага, справядлівага, з шырокім жыцьцёвым кругаглядам. Гэткім быў сам. Нікому ніколі ня кланяўся, ішоў па жыцьці з выпрастанай сьпінай і высока ўзьнятай галавой.**



З АРХІВУ К. ЛАШКЕВІЧА

### «Хай коні бегаюць!»

Вочнае знаёмства Сяргея Хамчука са спортам адбылося на пачатку 50-х. К таму часу, калі ён упершыню ступіў на бегавую дарожку, ён быў у цудоўнай фізычнай форме: праяжджаў па 70 кілямэтраў у дзень на ровары, пераплываў Дняпро ў самым шырокім месцы, па чатыры гадзіны лётаў на каньках.

Ужо значна пазьней, калі Хамчук стаўся вядомым трэнэрам, ён са сьмехам распавядаў сваім навучэнцам, як на першую прапанову заняцца лёгкай атлетыкай адрэзаў: «Хай коні бегаюць!» З часам, аднак, сваё рашэньне зьмяніў.

Яго першымі настаўнікамі сталіся вядомыя ў мінулым атлеты — чэмпіёны СССР Васіль Сідорка, Іван Анісімаў, Павал Савельеў. Заняткі яны праводзілі па чарзе, закладваючы моладзі ўнікальны фізычны падмурак.

Зь пераездам у Менск 18-гадовы хлапец з ладнай паставай і незвычайна лёгкай дый павольнай хадой прыйшоў на стадыён «Дынама». Выдатныя антрапамэтрычныя дадзеныя Хамчука адразу ацаніў заслужаны трэнэр Саюзу Барыс Левінсон: «Хлопчык, ты адкуль? Ці чуў пра Лунёва, Юліна (першыя беларускія алімпійцы ў складзе каманды СССР. — **Аўт.**)? Будзеш займацца ў мяне». Хутка настаўнік занёс дакумэнты новага вучня ў прыёмную камісію Інстытуту фізкультуры.

З тае пары жыцьцёвы шлях Сяргея Хамчука быў прадвызначаны. Хаця вялікім спартоўцам ён так і ня стаў. Левінсон быў засяроджаны на занятках з зоркамі, Хамчука пачалі турбаваць першыя траўмы. Падказаць не было каму. Ахіл балеў, а старанны пачатковец, замест таго каб зьнізіць нагрузкі, падвышаў іх. Паралельна перамагаў у інфізкультаўскіх спаборніцтвах па плаваньні, легендарны трэнэр Герман Бокун цягнуў у фэхтаваньне. Але да апошніх дзён Сяргей Хамчук застаўся верным каралеве спорту.

### Паклікальне жыцьця

Падчас навучаньня хлопца на 2-м курсе Інфізкульту ў сям'ю Хамчукоў заявілася бяда: раптоўна памёр бацька. Сяргей вымушаны быў ісьці зарабляць. 10 гадоў адпрацаваў трэнэрам у гарана, але зьляпіць прафэсійных атлетаў там было немагчыма: скончыўшы школу, падлеткі паступалі ў ВНУ, а гэта была ўжо іншая юрысдыкцыя. З тае прычыны перайшоў у студэнцкае спорттаварыства «Буравесьнік». І першы посьпех не прымусіў сябе доўга чакаць.

У 1969 г. ягоныя вучні Барыс Лютарэвіч і Валер Ціханкоў сталіся прызёрамі Ўсесаюзнай спартакіяды школьнікаў у спрынце. Праз год Ціханкоў перамог ужо на юнацкім першынстве СССР, а ў «залатой» эстафэце 4х100 трое з чатырох пераможцаў былі выхаванцамі Хамчука. Валер і Барыс яшчэ двойчы былі чэмпіёнамі Саюзу ў эстафэце: у 71-м — сярод юніёраў і ў 73-м — на 1-х Моладзевых гульнях.

Той час можна лічыць ці ня самым пасьпяховым у жыцьці Сяргея Хамчука. Ягонае імя загучала, і беларускага трэнэра запрасілі ў зборную СССР для працы са спрынтэрамі, а пазьней нават прапанавалі ўзначаліць моладзевую каманду краіны. Але наверсе кандыдатуру не зацьвердзілі: Хамчук ніколі ня быў сябрам КПСС.

Лютарэвіч і Ціханкоў падавалі вялікія надзеі: абодва беглі «сотню» за 10,4, а Барыс аднойчы апярэдзіў самога Барзова — але на гэтым і спыніліся. Першы, рыхтуючыся да эўрапершынства, атрымаў цяжкае пашкоджаньне, ажаніўся і пайшоў са спорту. Другі не жадаў працаваць па-сапраўднаму.

Амаль за паўстагодзьдзя плённай трэнэрскай працы ў лёгкай атлетыцы Сяргей Хамчук выгадаваў мноства таленавітых спартоўцаў. Першая алімпійка — Любоў Рунцо. У Мюнхене-72 яна выступала ў савецкай эстафэтнай камандзе 4х400 мэтраў. Тацяна Сасава — пераможца Кубку СССР, чэмпіёнка рэспублікі ў бегу на 100 і 200 м. Аднымі з наймацнейшых у рэспубліцы былі сёстры-блізьняты Галіна й Тацяна Рудніцкія. Але ўсе яны пасьля замужжа спынілі трэніроўкі. Руслан Фраемчук — чэмпіён Саюзу сярод юнакоў у зьвязцы 400 м + 800 м. Ігар Клімовіч — пераможца ўсесаюзнага першынства таварыства «Дынама» сярод школьнікаў…

Зь перадапошняй плеяды хамчукоўскіх выхаванцаў вышэй за ўсіх скочыў вышыньнік Аляксей Лёлін — удзельнік Алімпіяды-2000 у аўстралійскім Сыднэі.

Чаму ж ніхто з цэлага россыпу таленавітых юнакоў і дзяўчат так і не дасягнуў спартовых вышыняў? Адказ на гэтае пытаньне неадназначна даваў сам трэнэр: «Мае вучні аніколі не прымалі анаболікаў! Адзіны і самы здаровы сродак для аднаўленьня — пасьлятрэніровачны душ. Затое мае дзяўчаты заўжды нараджаюць нармальных дзетак. Амаль ніхто ня мае праблемаў са здароўем пасьля завяршэньня спартовай кар'еры. Гэта і ёсьць галоўнае».

Праўда, да выхаваньня адной алімпійскай зорачкі Хамчук меў непасрэднае дачыненьне. Сёньня ўвесь сьвет ведае чатырохразовую алімпійскую чэмпіёнку па фэхтаваньні Алену Бялову. А пачынала яна свой шлях у спорце якраз пад кіраўніцтвам Хамчука на дарожцы менскага «Дынама».

### Мастак трэніроўкі

Прыгадваецца, як бацька ўпершыню прывёў мяне на ягоную трэніроўку. Вясёлы, хударлявы і вельмі рухомы чалавек адразу схіліў да сябе нябачнай воку, але ўчутай сэрцам цеплынёй. Кожнае ягонае слоўца, кожны рух несьлі ў сабе станоўчы зарад сьветлай энэргіі.

Трэніроўкі ў Хамчука заўжды былі ўнікальнай зьявай. Ніводзін трэнэр не прысьвячаў столькі часу на распрацоўку заняткаў з адной толькі мэтай, каб вучням было цікава, каб кожны раз яны адкрывалі для сябе штосьці новае, каб іх цягнула на ўлюблёны ўсімі хамчукоўскімі стадыён «Дынама». Трэніровачныя пляны былі напісаныя на картках, упрыгожаных ілюстрацыямі, афарызмамі, прыказкамі, пажаданьнямі, добрымі парадамі… Ну скажэце, які яшчэ трэнэр памятаў даты народзінаў кожнага з сваіх вучняў і на ўрачыстым пастраеньні віншаваў імяніньніка набытым за ўласныя грошы прэзэнтам?!

«Шэф» — так мы зь вялікай павагай называлі нашага настаўніка між сабой — быў для ўсіх найвялікшым аўтарытэтам. На пытаньне «А вы ў каго?» заўсёды з гонарам прамаўлялі: «У Хамчука!» У яго не было любімчыкаў ці непэрспэктыўных. Усе, хто займаўся ў групе Хамчука, заўжды атрымлівалі роўную ўвагу настаўніка. На спаборніцтвах ён з аднолькавым імпэтам хварэў як за старэйшых, так і за самых маленькіх вучняў.

Аднаго з двух сваіх алімпійцаў — скакуна ў вышыню Аляксея Лёліна, як і шмат каго яшчэ, Хамчук вёў з пачатковай школы. «Сяргей Андрэевіч быў нам як бацька. Да яго заўсёды можна было прыйсьці і спытацца парады па любым пытаньні», — кажа Аляксей.

Яго галоўнай мэтай было выгадаваць сапраўднага чалавека — інтэлігентнага і разважлівага, справядлівага і з шырокім жыцьцёвым кругаглядам. Гэткім быў сам. Нікому ніколі ня кланяўся, ішоў па жыцьці з выпрастанай сьпінай і высока ўзьнятай галавой. За гэта неаднойчы цярпеў з боку тых, хто мае паўнамоцтвы, але ніколі ня чуў пра гонар і сумленьне.

Вучні Хамчука ня сталіся вялікімі спартоўцамі, але ўсе яны знайшлі годнае месца ў жыцьці. Барыс Лютарэвіч абараніў кандыдацкую па фізыцы, Валянціна Марачкіна — таксама кандыдат, эканамічных навук, Ігар Папкоўскі — народны судзьдзя, Мікалай Сердзючэнка — галоўны доктар 1-й клінічнай больніцы. Валянціна Вялігурская — інжынэр-эканаміст, Кацярына Буцкевіч пайшла шляхам настаўніка…

Яшчэ за два месяцы да сьмерці зьнясілены цяжкай хваробай Сяргей Хамчук горача перажываў на спаборніцтвах за сваю апошнюю надзею Данілу Гарадзецкага. А ўжо ў сьнежні 2003 у менскім спарткомплексе «Дынама» ў 26-ы раз адбыліся традыцыйныя рэспубліканскія дзіцяча-юнацкія спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы, якія ў першы раз мелі імя заслужанага трэнэра Беларусі Сяргея Хамчука. Унікальная зьява — на турніры памяці любімага трэнэра прысутнічалі прадстаўнікі пяці розных пакаленьняў ягоных вучняў. І з вуснаў усіх нязьменна гучала ўдзячнае: «Ён зрабіў з нас людзей!»

**Кастусь Лашкевіч**

КОШТЫ

**Рэклямныя расцэнкі на платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на старонку 16:**
да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб., за кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 4000 руб. Аформленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 650 руб.

БЛІЗКАЯ ГІСТОРЫЯ

# Чужы сярод сваіх



## КОНКУРС ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ

**Пераможцаў чакаюць прызы!**

ГА «Дыярыюш» пры ўдзеле Таварыства беларускай мовы абвяшчае конкурс «Чужы сярод сваіх».

У конкурсе могуць браць удзел вучні сярэдніх навучальных установаў (з 7-га клясы), а таксама навучэнцы каледжаў, ПТВ, тэхнікумаў (да 19 год).

Форма працы адвольная: сачыненьне, інтэрвію, фільм і інш. Да нятэкставай працы (аўдыё-, відэа-, фатаздымкі), павінна быць далучана пісьмовая частка: адлюстраваньне працэсу дасьледаваньня альбо камэнтар да крыніц.

Працу пажадана пісаць па-беларуску.

Да працы мае быць далучана анкета ўдзельніка зь яго прозьвішчам, імем, каардынатамі і назвай працы.

Працу трэба дасылаць у адным асобніку да 25 лістапада 2004 г. (дата вызначаецца паводле паштовага штэмпеля) на адрас: «Блізкая гісторыя», а/с 128, 220064, Менск.

Вынікі будуць абвешчаны **25 сакавіка 2005 г.**

Інфармацыю, парады і брашуру, у якой падрабязна выкладзены ўмовы, можна атрымаць ад сакратаркі конкурсу Ірыны Коваль (т.: (8-017) 223-61-42, 8-029-613-60-87, e-mail: historyja@belinternet.net).

Зычым посьпехаў!



Людка Сільнова

### Навошта езьдзім мы ў каробках мэталічных?

«Навошта езьдзім мы ў каробках мэталічных
Штораніцы, штовечар і штоноч?
Апроч аўтобусаў, тралейбусаў прывычных
Ёсьць пара верных служкаў — хуткіх ног...»

Я зноў іду скрозь горад, як лячу скрозь гора.
Так на зьмярканьні, перагнаўшы гром,
Ляціць маланка — зьнітаваць сабой прастору
Скрозь хмару, набрынялую дажджом.

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ З №18



ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**САДОК**

**Дзіцячы садок** №314 (Багдановіча, 68а) распачаў набор дзетак 2—5 гадоў у дзьве беларускамоўныя групы. Гарантаваны беларускамоўны асяродак і гурткі па жаданьні бацькоў. Т.: 234-50-25 (Лілія Віктараўна, загадчыца), 233-61-89 (бацькі, Вераніка і Міхась)

**ГАРАЖ**

**Прадаецца** капітальны гараж (каапэратыў «Сьцяпянка-2») 5,9х3,2. Падвал па пэрымэтры. Сьвятло. Ахова. Т.: 220-32-93

**ВІТАНЬНІ**

**Шляхетнага гісторыка** Генадзя Сагановіча віншуем з нараджэньнем сына Ўсяслава. Калегі (прабач, што запозьнена)

**Віктара Шляхціна** віншуем з днём народзінаў! Зычым здароўя, моцы, добрага шлюбу і дзетак! Сябры

**КАНТАКТЫ**

**Шукаю цікавую спадарожніцу** для вандровак па гістарычнай Беларусі ў чэрвені і ліпені. Т.: 8-029-766-72-88. Віктар

**Пазнаёмлюся** зь беларускім хлопцам. Валянціна. Т.: 259-97-80

**Шукаю кантактаў** зь беларусамі Нямеччыны (пажадана зь зямлі Паўночны Рэйн-Вэстфалія). Электронны адрас: blason@tut.by

**Купалавы чытаньні** — штотыдзень у нядзелю ад 14-й да 16-й ля помніка Паэту. «Дзякуй тым, хто нашу мову родную ўскрашае»

**Запрашаем** на экзатычны адпачынак у міжнародны археалягічны летнік «Камунікацыя Палятыды». Т.: 8-029-776-26-75. Вэбсайт: http://www.bonalita.narod.ru

**КНІГІ, МУЗЫКА**

**Набуду** беларускамоўныя кнігі (сучасная беларуская, сусьветная і расейская літаратура), слоўнікі нерусіфікаванай мовы, справаводзтва. Каця. Т.: 229-58-19

**CD** «Генэралы айчыннага року» ў Берасьці. Т.: 8-029-727-44-83. Андрэй

**Сайт** сярэднявечнай беларускай музыкі — www.staryolsa.com

**Кнігу** «Месца выданьня — Парыж» пра жыцьцё пасьляваеннай беларускай дыяспары ў Францыі можна набыць: Менск — «Цэнтральная кнігарня», «Акадэмкніга», «Сьветач», «Падпісныя выданьні», «Кнігарня пісьменьніка», Берасьце — «Іскра», Баранавічы — «Кнігі», Полацак — «Сьветач»

**Кнігі** беларусаў замежжа, дзіцячыя кнігі, відэа, аўдыё, CD, энцыклапэдыі, слоўнікі, навучальныя дапаможнікі, газэты, календары, майкі на Румянцава, 13 (ТБМ), 12.00 — 19.00 з панядзелка да пятніцы

**Набуду** кнігу «Кастусь Каліноўскі» з сэрыі «Беларускі кнігазбор», укладальнік Г.Кісялёў. Т.: (8-017-16) 5-78-83

**29—31 траўня**
**запрашаем у вандроўку**
**«Золота Підкова Львоўшчыны»**

Менск—Жоўква—Крэхіў—Львоў—Алеск—Падгорцы—Золачыў—Сьвірж—Менск
Кошт вандроўкі: для дарослых 45 у.а. + 15 000 руб., для школьнікаў і студэнтаў — 40 у.а. + 15000 руб.

Кошт уключае: праезд аўтобусам, начоўку ў гатэлі «Львоў», экскурсійнае абслугоўваньне без уваходных квіткоў (квіткі ў замкі каштуюць 0,1—0,5 у.а.).

Неабходныя дакумэнты: пашпарт, для непаўналетніх — натарыяльна пацьверджаны дазвол на выезд за мяжу ад абаіх бацькоў.

Т.: 8-029-755-03-70, 222-88-76



**КУПЛЮ**

**Куплю** ўзнагароды БНР, БЦР, БКА, манэты ВКЛ, Рэчы Паспалітай. Т.: 8-029-722-46-04

**ПРАЦА**

**Якасна** выканаю пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя. Юрась. Т.: 235-18-72 (пасьля 17-й)

**Запрашаем на падарожжа**

**22—23 траўня** (субота, нядзеля)
**Берасьце—Скокі—Чарнаўчыцы—Высокае—Камянец—Воўчын—Белавеская Пушча.**

**30 траўня** (нядзеля)
**Смургоні—Сьвір—Засьвір—Шэметава—Лынтупы—Камаі—Паставы—Нарач—Мядзел.**

Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер) 264-12-38, 776-24-35 (Павал)

# Зь Беларусі – у Эўропу

Абвяшчаецца конкурсны набор на ліцэйскія курсы для вучняў, што сёлета сканчаюць 7—9 клясы сярэдніх школаў Менску й Менскага раёну. На курсах вывучаюцца дысцыпліны базавай і сярэдняй школы на ўзроўні, дастатковым для здачы экстэрнам экзаменаў на атрыманьне пасьведчаньня аб базавай і атэстату аб сярэдняй адукацыі. Паглыблена, у індывідуальным парадку, вывучаюцца дысцыпліны гуманітарнага цыклу: беларуская і замежныя мовы, літаратура, гісторыя, геаграфія.

Навучаньне вядзецца выкладчыкамі колішняга Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа паводле праграмаў, распрацаваных у Ліцэі.

Распрацоўваюцца пляны стварэньня прыватнага Беларускага гуманітарнага ліцэю, у якім змогуць займацца навучэнцы ліцэйскіх курсаў, а таксама арганізацыі навучальнага працэсу за мяжой. Выпускнікі Ліцэю будуць мець магчымасьць атрыманьня бясплатных стыпэндыяў на навучаньне ва ўнівэрсытэтах эўрапейскіх краінаў.

Больш падрабязную інфармацыю пра ўмовы конкурсу можна атрымаць праз тэлефоны: 8-0296-29-59-03; 8-0296-39-27-15; 8-0296-33-48-59.

Курсы ладзіць індывідуальная прадпрымальніца Савіцкая У., пасьв. №690215877, выд. Менскім аблвыканкамам 4.01.2003.

**Шукаю памяшканьне**

**ў арэнду** (ня толькі ў Менску) пад бытавыя паслугі. У людным месцы, не вышэй за першы паверх. Ад 5 да 60 кв.м.
Т.: 8-029-626-05-41, (017)264-27-69

**Запрашаем у вандроўку**

**23 траўня**

**Браслаў**
Замкавая гара (старажытнае гарадзішча IX ст.).
Драўляны калодзеж XIX ст.
Касьцёл 1824 г.
Царква 1897 г.
Больніца С.Нарбута (канец XIX — пач. XX ст.).
Сядзібная забудова (1-я трэць XX ст.).
!!!!!!!!!!!!! **Фэст «Браслаўскія зарніцы»**
Кошт — 21000 р. для дзяцей і 23000 р. для дарослых.

Тэлефануйце: 222-88-76, 755-03-70;
http://altusplus.narod.ru

**Маладзевая вечарына**
**26 траўня**

Прымаюць удзел: гурты **«4.8», «я і джынджэр», бард Зьміцер Казлоўскі.**
Варвашэні 8, у 18:00.
Уваход вольны.
Даведкі: 668 50 71, 409 94 05, 762 39 71.

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ____________________

**Імя і прозьвішча** ____________________

**Адрас, тэлефон** ____________________

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фота-рэдактар — Арцём Лява
карэктар — Сяргей Петрыкевіч
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3534. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 22.00 19.05.2004.

Замова № 2978.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а